НАКАРМІЦЬ СТУДЭНТА. СМАЧНА І ТАННА

ЧЫРВОНКА

ЯК СТАНОВЯЦЦА БАРБЕРАМІ? ЧЫРВОНКА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

1 ЛІСТАПАДА 2018 г. ЧАЦВЕР № 211 (28827)

ЦЫТАТА ДНЯ

Максім ЕРМАЛОВІЧ, міністр фінансаў:

«Беларусь плануе атрымаць ад Расіі $630 млн на рэфінансаванне дзярждоўгу ў 2019 годзе. Аб'ём прыцягнутых рэсурсаў будзе адпавядаць аб'ёму пагашэння асноўнай часткі доўгу перад Расійскай Федэрацыяй. Гэты падыход узгоднены паміж мінфінамі і расійскім Мінфінам пацверджаны. Для нас гэта магчымасць рэфінансаваць частку абавязацельстваў па 2019 годзе. Валюта, у якой будуць праведзены запазычанні, яшчэ абмяркоўваецца. Хутчэй за ўсё, у доларах. Мы знойдзем спосаб пагасіць усе астатнія абавязацельствы».

КАРАТКА

- У Кітаі праходзіць Форум супрацоўніцтва СМІ «Адзін пояс, адзін шлях» — 2018. Сярод удзельнікаў і прадстаўнікі Выдавецкага дома «Звязда».
- **У Беларусі збіраюцца будаваць прыватныя дамы, дзе квадратны метр будзе каштаваць $300 у эквіваленце без адстройвання.**

- Комплекс мер па барацьбе з жуком-караедам па праекце Праграмы малых грантаў выпрацаваны ў Краснапольскім раёне.
- **Беларуская чыгунка аднавіла продаж білетаў да Адлера.**
- Птушкай 2019 года ў Беларусі абвешчаны вялікі арлец.

ISSN 1990 - 763X

У МІНСКУ ЗНОЎ ГАВОРАЦЬ ПРА МІР

«Калі не спыніць махавік канфрантацыі, то палыхне ўжо не толькі Украіна і Усходняя Еўропа»

Сусветныя канфлікты, украінскія падзеі, «Хельсінкі-2» і членства Беларусі ў ЕС — гэтыя і іншыя тэмы закрануў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падчас выступлення ў Мінску на адкрыцці сустрэчы Асноўнай групы Мюнхенскай канферэнцыі па бяспецы.

НА КРАІ БЕЗДАНІ

У пачатку кіраўнік дзяржавы адзначыў, што Мюнхенская канферэнцыя — адзін з найстарэйшых і найбольш аўтарытэтных палітычных форумаў у свеце, дзе на ўзроўні экспертаў абмяркоўваецца праблематыка бяспекі ў глабальным сэнсе. Сярод асноўных яе задач ён назваў аб'ектыўны аналіз сітуацыі, якая складваецца, выпрацоўку канструктыўнага парадку дня, пашырэнне ўзаемадзеяння і ўмацаванне бяспекі не толькі ў Еўропе, але і за яе межамі.

«Сёння няма больш важнага пытання, чым захаванне міру, прытым у цэлым на планеце, — падкрэсліў беларускі лідар. — Актуальнасць гэтай тэмы пацвярджае і ўражальны склад удзельнікаў канферэнцыі, і пералік праблем, якія абмяркоўваюцца, у якім знайшлі адлюстраванне найбольш вострыя для нашага рэгіёна «болевыя кропкі»: ад рознагалоссяў па лініі Усход — Захад да канфлікту ва Украіне».

Прэзідэнт са шкадаваннем пагадзіўся з высновамі апошняга даклада Мюнхенскай канферэнцыі аб тым, што наша планета падышла да краю бездані, за якой знаходзіцца глабальны канфлікт. Паводле яго слоў, канфрантацыя стала адным з вызначальных фактараў развіцця міжнародных адносін, у тым ліку і ў еўрапейскім рэгіёне.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў прысутным, што ўзброеныя супрацьстаянні ідуць практычна на ўсіх кантынентах. Канфлікты на Блізкім Усходзе і ў Азіі ўзмацняюцца спробамі падзяліць рэгіёны на сферы ўплыву. У Афрыцы паслабленне цэнтральных улад суправаджаецца ўзмацненнем радыкальных ісламісцкіх груповак.

«Канфлікт, які тлее, а па сутнасці — няспынная вайна на Данбасе, гэта вайна тут, у нашай з вамі Еўропе», — канстатаваў кіраўнік дзяржавы.

Беларускі лідар звярнуў увагу на тое, што колькасць бежанцаў у свеце лічыцца ўжо не сотнямі тысяч, а мільёнамі.

Ён таксама дадаў, што гандлёвыя супярэчнасці паміж ЗША і Кітаем, у якіх лік ідзе на сотні мільярдаў долараў, пачынаюць правакаваць супрацьстаянне Вашынгтона і Пекіна ў іншых сферах узаемадзеяння — нароўні з тэрмінамі «халодная» ці «ледзяная» вайна ўжо гавораць пра перспектывы «халоднай гандлёвай вайны». Прэзідэнт адзначыў, што ўсё больш відавочны характар набываюць і рознагалоссі паміж ЗША і ЕС, самымі блізкімі саюзнікамі.

Фота БелТА.

Аляксандр Лукашэнка заявіў, што прорва недавер паміж Расіяй і Захадам цяпер значна шырэйшая, чым у папярэднія складаныя перыяды найноўшай еўрапейскай гісторыі. Акрамя таго, ідуць маштабныя санкцыйныя і інфармацыйныя войны.

Ён дадаў, што трывожная сітуацыя склалася вакол дагавораў аб ліквідацыі ракет сярэдняй і меншай далёкасці, а таксама аб скарачэнні стратэгічных наступальных узбраенняў.

«Вялікія дзяржавы страчваюць статус гарантаў стабільнасці. Яны не могуць прыйсці да адзінага меркавання ні па адным з найсур'ёзных пытанняў», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

На яго думку, Савет Бяспекі ААН ператварыўся ў пляцоўку для высвятлення адносін: на агульнапалітычнай дыскусіі ў рамках цяперашняй, 73-й, сесіі Генасамблеі ААН кожны кажа пра свае інтарэсы, прэтэнзіі, заклапочанасць і мала хто — пра тое, што трэба садзіцца за стол перагаворaў і змяняць сітуацыю.

Беларускі лідар акцэнтаваў увагу на тым, што ўжо не толькі сусветныя палітыка, эканоміка, але і спорт, іншыя нейтральныя сферы міжнароднага супрацоўніцтва становяцца арэнай супрацьстаяння некаторых дзяржаў.

СТАР. 2

Абітурыент-2019

ЯК ПАДЛІЧЫЦЬ БАЛЫ НА ЦТ?

Арганізатары ўступных экзаменаў паспрабавалі расставіць кропкі над «і»

Да старту новай прыёмнай кампаніі яшчэ каля васьмі месяцаў, але вакол яе ўжо разгарэліся гарачыя дэбаты. Прычына — увядзенне новай методыкі падліку балаў на ЦТ. Нельга сказаць, што жаданне Міністэрства адукацыі адмовіцца ад рэйтынгавай шкалы, якая прымянялася 12 гадоў для абітурыенцкага тэсціравання, стала нечаканасцю. Больш за тое, гэтым летам прайшла мадэльная апрабацыя новай сістэмы, гэта значыць, што вынікі ўдзельнікаў ЦТ 2018 года ацэньваліся як па ранейшай, так і па новай методыцы. Але балы, якія абітурыенты ўбачылі ў сваіх сертыфікатах, разлічваліся яшчэ па старой методыцы. Відаць па ўсім, новая апраўдала ўскладзеныя на яе надзеі, і два тыдні таму стала вядома, што тэставыя балы і на рэпетыцыйным, і на цэнтралізаваным тэсціраванні цяпер будуць разлічвацца па-новаму. Вось толькі атрыманыя падчас першага раўнда рэпетыцыйнага тэсціравання вынікі адразу выклікалі шмат пытанняў у абітурыентаў, педагогаў і рэпетытараў. Апошнія нават падрыхтавалі зварот да Міністэрства адукацыі, у якім яны агучылі свае асцярогі, падзяліліся бачаннем сітуацыі і прапанавалі... ад новай сістэмы адмовіцца. Міністэрства адукацыі вырашыла агучыць сваю пазіцыю і запрасіла журналістаў на прэс-канферэнцыю.

СТАР. 4

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СЯБРОЎ У НОВЫМ ГОДЗЕ НЕ МЯНЯЮЦЬ!

Пачалася падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2019 года.

Заставайцеся з намі — будзе цікава!

У МІНСКУ ЗНОЎ ГАВОРАЦЬ ПРА МІР

У ДАПАМОГУ БЛІЖНЯМУ

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што на адкрыцці летняй сесіі Парламенцкай асамблеі АБСЕ ў Мінску ў ліпені мінулага года беларускім бокам была прапанавана ідэя новага Хельсінкскага працэсу. «Тады мы нярэдка чулі, што, маўляў, Беларусь была занадта наіўная, агучваючы такога роду прапанову», — адзначыў ён.

Паводле слоў беларускага лідара, наша краіна выходзіць з таго, што ва ўмовах, калі гэтая сістэма дае збой (бо яна не дазволіла прадухіліць крывавыя канфлікты ў Еўропе, напрыклад, у Югаславіі і Украіне), трэба прымаць меры, каб аднавіць яе эфектыўную дзейнасць.

«Пры гэтым Беларусь не з'яўляецца інструментам нейкага трэцяга боку, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Наша прапанова — не спроба вярнуцца да папярэдніх ініцыятыў. Беларуская дзяржава выступае за інклюзіўны дыялог, нават калі няма гарантыі таго, што ён завершыцца канкрэтным вынікам».

У сувязі з гэтым Беларусь бачыць неабходным у цяперашняй абстаноўцы развіццё міждзяржаўных адносін, у тым ліку нефармальных. Прычым па любой тэматыцы ў сферы бяспекі, дзе гэта магчыма ці дзе ў бакоў-апанентаў ёсць супадаючыя інтарэсы.

«Мы не прэтэндуем на манаполію гэтай ініцыятывы, — зноў звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы. — Разумеем, што яе рэалізацыя залежыць ад згоды многіх, у першую чаргу ключавых гульцоў. Але ў сучасных умовах, калі вялікія дзяржавы не могуць дамовіцца, сваю важную ролю могуць і павінны адыграць іншыя краіны».

Паводле яго слоў, у Беларусі разумеюць, што такі дыялог у той жа час будзе значна адрозніваццца ад таго, які быў у рамках Хельсінкскага працэсу. Ён дадаў, што «Хельсінкі-2» — гэта, хутчэй, метафара для абазначэння сутнасці новага працэсу — пошуку сучасных шляхоў і спосабаў сысці ад небяспекі вялікага канфлікту. Пры гэтым беларускі лідар падкрэсліў, што рашэнні па выхадзе з крызісу не павінны паўтараць «рэцэпты» халоднай вайны. Аднак на сёння ў Еўропе няма адзінага меркавання аб тым, як павінна быць уладкавана абноўленая сістэма бяспекі.

РАШЭННЕ ПРАБЛЕМ ЁСЦЬ

«Тым не менш, нягледзячы на адсутнасць палітычных перадумоў для запуску новага перамоўнага працэсу, неабходна шукаць магчымасці для прапрацоўкі яго асноў. Няхай для пачатку на экспертным узроўні, а затым і асноўнымі гульцамі. Верагодна, менавіта экспертная супольнасць зможа падказаць неардынарныя выхады з сітуацыі», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт нагадаў, што тры тыдні таму ў Мінску пад эгідай АБСЕ прайшла Міжнародная канферэнцыя высокага ўзроўню па барацьбе з тэрарызмам у лічбавую эпоху. Яе ўдзельнікі сышліся ў меркаванні, што, толькі выступіўшы адзіным фронтам, можна паспяхова супрацьстаяць кібертэрарызму і іншым сучасным выклікам і пагрозам.

«У якасці наступнага кроку Беларусь гатова прыняць у сябе сумесную канферэнцыю ААН і АБСЕ па барацьбе з тэрарызмам і саміт па барацьбе з кіберзлачыннасцю, — заявіў кіраўнік дзяржавы. — З улікам прысутнасці тут і спадара Грэмінгера, і спадара Ішынгера прапаную ўсім падумаць над аднаўленнем пад эгідай АБСЕ дзейнасці «Групы мудрацоў» з ліку вядомых палітыкаў і аналітыкаў».

Ён дадаў, што іх задачай стане выпрацоўка рэкамендацый стратэгічнага характару па агульных пытаннях бяспекі ў еўра-атлантычнай і еўразійскай прасторах. Паводле слоў беларускага лідара, у нашай краіне вераць, што такі дыялог у канчатковым выніку зрабіў бы магчымым правядзенне саміту і прыняцце стратэгічнага дакумента, прымальнага для ўсіх.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ніхто ў Еўропе і за яе межамі не хоча адкрытага ваеннага сутыкнення Захаду і Усходу, але сёння ў рэгіёне відавочна буйная палітычная і эканамічная «замова» на эскалацыю напружанасці. Пачынаецца міжблокавае супрацьстаянне, бо проціборства ўцягвае новыя краіны.

На думку Прэзідэнта, канфлікт можна было б змякчыць і ліквідаваць у многіх выпадках, але палітычнай волі на гэта няма.

«Калі ў найбліжэйшы час не спыніць махавік канфрантацыі і працэс злому агульнапрызнаных правілаў гульні, то палыхне ўжо не толькі Украіна і Усходняя Еўропа. Так недалёка і да ядзернага канфлікту паміж геапалітычнымі гульцамі, у якім не будзе пераможцаў», — сказаў ён.

АБ СІТУАЦЫІ ВА УКРАІНЕ

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: рашэнне ўкраінскага канфлікту — сёння ключавое пытанне бяспекі ў Еўропе, без урэгулявання якога мір на кантыненце будзе заставацца пад пагрозай.

«На цяперашні момант мы вымушаныя канстатаваць, што з задачай спыніць супрацьстаянне на паўднёвым усходзе Украіны ніхто не спраўляецца. Ні «Нарманд-ская чацвёрка», ні Трохбаковая кантактная група АБСЕ, ні Спецыяльная маніторынгавая місія АБСЕ ва Украіне, ні фармат Уолкер-Суркоў», — дадаў ён.

Самае жудаснае, на яго думку, што гінуць тыя, хто застаўся там, — жанчыны, дзеці і старыя, якія не могуць з'ехаць, бо ехаць няма куды, яны прывязаны да сваёй зямлі.

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што з моманту прыняцця Мінскіх пагадненняў прайшло больш за тры з паловай гады, але цалкам ні адзін з пунктаў так і не рэалізаваны. На думку беларускага лідара, гэта не азначае, што пагадненні дрэнныя. Ідзе нагнятанне сітуацыі, не спыняюцца пастаўкі ўзбраення.

Асобна ён выказаўся аб размяшчэнні бежанцаў на тэрыторыі Беларусі: іх забяспечылі ўсім неабходным, аказалі дапамогу ў працаўладкаванні, забяспечылі медыцынскае абслугоўванне, нягледзячы на няпростую сацыяльна-эканамічную сітуацыю ў самой Беларусі.

Прэзідэнт падкрэсліў: пры жаданні рашэнне канфлікту на Данбасе магло б быць ужо даўно знойдзена. Што рабіць далей? Аляксандр Лукашэнка прапанаваў наступнае: працягваць работу па ўзмацненні магчымасцяў Спецыяльнай маніторынгавай місіі АБСЕ ва Украіне і Трохбаковай кантактнай групы. Паводле яго слоў, у Беларусі гатовы разгледзець стварэнне ў Мінску тэхнічнага пункта Трохбаковай кантактнай групы.

Акрамя таго, неабходна весці далейшы пошук узаемапрымальнага рашэння па размяшчэнні на Данбасе міратворцаў, трэба забяспечыць прынцып паэтапнасці ў разгортванні гэтай місіі. Яшчэ, на думку беларускага лідара, варта было б актывізаваць работу ў «Нармандскім фармаце», каб забяспечыць дакладны механізм кантролю за выкананнем Мінскіх пагадненняў.

«Мы можам узяць на сябе адказнасць за забеспячэнне міру ва ўсходніх рэгіёнах Украіны і кантроль на расійска-ўкраінскай мяжы. А таксама суправаджаць правядзенне выбараў на Данбасе, зыходзячы з разумення таго, што гэтыя рэгіёны з'яўляюцца неад'емнай часткай Украіны», — дадаў ён.

Прэзідэнт падкрэсліў: Беларусь гатова вырашыць гэтую праблему толькі ў выпадку ўпэўненасці ў тым, што асноўныя сусветныя гульцы хочуць міру ў Еўропе. Ён зноў адзначыў: гэтая вайна нікому не патрэбная. Самая сур'ёзная памылка — пачынаюць шукаць вінаватых. Шукаць вінаватых — гэта дзецям можна пакінуць, яны разбяруцца, калі захочуць, а сёння трэба вырашаць праблему, рэзюмаваў Прэзідэнт. Кіраўнік дзяржавы таксама звярнуў увагу, што за стол перагавораў трэба прыцягнуць ЗША — без гэтага мэты нарад ці ўдасца дасягнуць.

НЕ БУФЕР, НЕ «БАСТЫЁН»

У завяршэнні Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што Беларусь не хоча апынуцца на лініі новага цывілізацыйнага разлому, на лязе блокавага супрацьстаяння Усходу і Захаду. Ён таксама дадаў, што з ростам гэтых працэсаў Беларусі прадказваюць лёс буфера або «бастыёна» паміж Расіяй і НАТА.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што гэты рэгіён стаў бы поясам стабільнасці і ўзаемадзеяння, калі б не розныя ваенна-палітычныя блокі. Беларускі лідар заклікаў звярнуць пільную ўвагу на інтэнсіфікацыю супрацоўніцтва з нашай краінай.

Ён нагадаў пра «праблемы з правамі чалавека», якія прыпісваюць Беларусі. «Тут дарэчы нагадаць, што развітая еўрапейская дэмакратыя фарміравалася стагоддзямі, а ад нас хочуць рыўка за некалькі дзясяткаў гадоў. Калі рабіць гэта скачкападобна, праз ціск, вынік будзе няўстойлівы. Таму мы ідзём па шляху эвалюцыі, а не рэвалюцыі», — сказаў Прэзідэнт.

Ён раскрытыкаваў еўрапейскую дэмакратыю і дадаў, што хутка ёй будуць вучыцца ў Беларусі, паколькі ў нас у аснове ляжыць стабільнасць і нармальнае жыццё людзей.

Кіраўнік дзяржавы дадаў, што Беларусі патрэбныя нармальныя гандлёва-эканамічныя адносіны з Еўропай. У нашай краіны ёсць імкненне, каб ЕС стаў адной з апор знешняга гандлю Беларусі, супастаўнай з Расіяй і ЕАЭС.

Паводле яго слоў, у нашай краіне ведаюць сапраўднае стаўленне да Беларусі і іншых краін постсавецкай прасторы. Ён адзначыў, што некаторыя палітыкі ў Еўропе маюць намер абмяжоўваць развіццё супрацоўніцтва. Прэзідэнт пацікавіўся, якой жа рэакцыі тады чакаюць ад Беларусі, Расіі? Аснова супрацоўніцтва — эканоміка, а што рабіць, калі беларускія тавары аспрэчваюць у Еўропе? Пры гэтым Беларусь сваімі межамі абараняе ЕС ад крыміналу, зброі, наркотыкаў.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: мы не прэтэндуем на членства ў ЕС і ідзём да еўрапейцаў зусім не з працягнутай рукой.

Прэзідэнт дадаў, што ў нашы дні попыт на дыялог і ўмацаванне даверу ў свеце значна перавышае прапанову. «Беларусь спрабуе па меры сіл садзейнічаць выраўноўванню гэтага дысбалансу. Такую аб'яднаўчую палітыку мы збіраемся праводзіць і надалей, калі яна патрэбна», — заявіў ён.

Прэзідэнт таксама прыняў удзел у дыскусіі, падчас якой абмяркоўваліся актуальныя пытанні бяспекі.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

* * *

Перад пасяджэннем беларускі лідар сустрэўся з памочнікам Дзяржаўнага сакратара ЗША па еўрапейскіх і еўразійскіх справах Ааранам Уэсам Мітчэлам.

«Ужо сам факт вашага знаходжання ў сталіцы Беларусі гаворыць пра многае, — звярнуў увагу на пачатку сустрэчы Аляксандр Лукашэнка. — Асабіста я вельмі разлічваю, што гэта будзе сапраўды гістарычны візіт. Візіт, з якога пачнецца няхай паступовы і павольны выхад з таго стану, у якім знаходзяцца беларуска-амерыканскія адносіны».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: «У Беларусі праводзіцца палітыка суверэннай і незалежнай дзяржавы, нягледзячы ні на кога. Мы хочам быць суверэннымі і незалежнымі. І ў гэтых адносінах мы роўна набліжаны да ўсіх цэнтраў сілы нашай планеты». Ён звярнуў увагу на тое, што нават у самыя складаныя часы для двухбаковых адносін Беларусь вельмі зацікаўлена ў добрых зносінах з ЗША.

«Я хацеў бы падкрэсліць тое значэнне, якое Злучаныя Штаты Амерыкі надаюць пытанню незалежнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Рэспублікі Беларусь, — сказаў у адказ памочнік дзяржсакратара. — Мы выдатна разумеем глыбокія і блізкія ўзаемаадносіны вашай краіны і Расійскай Федэрацыі, якія склаліся гістарычна. І мы выдатна разумеем той поспех, якога вы дабіліся ў справе забеспячэння стабільнасці, тэрытарыяльнай цэласнасці, у першую чаргу — палітычнай, у Беларусі». Памочнік дзяржсакратара таксама дадаў, што ЗША бачыць вялікі патэнцыял у развіцці як дыпламатычных, так і эканамічных сувязяў паміж дзвюма краінамі.

* * *

Пасля заканчэння дыскусіі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з прэм'ер-міністрам Сербіі Анай Брнабіч, якая ўдзельнічала ў сустрэчы Асноўнай групы Мюнхенскай канферэнцыі па бяспецы.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў Беларусі ўважліва сочаць за тым, што адбываецца ў Сербіі, і перажываюць за праблемы гэтай краіны, радуюцца, калі ўсё ідзе добра. Прэм'ер-міністр Сербіі падчас двухбаковай сустрэчы перадала Прэзідэнту запрашэнне яго сербскага калегі наведаць Бялград.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.

Парламенцкі дзённік

ДЗЕСЯЦЬ ТОП-ЗАДАЧ

А галоўная — павышэнне жыццёвага ўзроўню беларусаў

Пра гэта заявіў прэм'ер-міністр краіны Сяргей РУМАС, прадстаўляючы ў Палаце прадстаўнікоў праграму дзейнасці ўрада на 2018—2020 гады. Дакумент папярэдне абмяркоўваўся на пасяджэннях усіх камісій ніжняй палаты парламента. Пасля даклада кіраўніка ўрада парламентарыі маглі задаць фінальныя пытанні.

Сяргей Румас адзначыў, што ўсе дакументы арыентаваны на адзіныя мэты і прыярытэты. Важна забяспечыць комплекснае выкананне ўсіх палажэнняў, прадугледжаных прынятымі праграмнымі дакументамі. Тут задача не толькі ўрада — павінны быць кансалідаваны намаганні органаў дзяржаўнага кіравання на ўсіх узроўнях.

Праграма, якая прапаноўваецца, адрозніваецца шэрагам падыходаў, на што звярнуў увагу прэм'ер-міністр. Галоўная задача — павышэнне жыццёвага ўзроўню беларусаў. На гэта накіравана пераарыентацыя бюджэтна-падатковай палітыкі.

У дзесяць топ-задач, як іх назваў Сяргей Румас, уваходзяць развіццё прадпрымальніцкага асяроддзя і стварэнне камфортных умоў вядзення бізнесу, апераджальнае развіццё сферы паслуг, фарміраванне ІТ-краіны і маштабная лічбавізацыя ўсёй эканомікі, правядзенне эфектыўнай бюджэтна-фінансавай і падатковай палітыкі, забеспячэнне ўстойлівага нізкага ўзроўню інфляцыі, эфектыўнае кіраванне дзяржаўнай уласнасцю, актывізацыя знешнеэканамічнай дзейнасці, удасканальванне інвестыцыйнай палітыкі, зніжэнне міжрэгіянальнай дыферэнцыяцыі і забеспячэнне дастойных умоў жыцця насельніцтва і аплаты працы.

Кіраўнік Савета Міністраў коратка спыніўся на асноўных кірунках. У прыватнасці, адзначыў, што «неабходна стварыць празрыстае прадказальнае заканадаўства, якое выключае прыняцце залішніх абцяжарванняў і новых бар'ераў для развіцця бізнесу. Сфарміраваць прававое асяроддзе, якое стане для інвестара гарантам стабільнасці работы на нашым рынку».

Што датычыцца праекта новай рэдакцыі Падатковага кодэкса, асноўны ўхіл у дакуменце зроблены на тое, каб спрасціць падатковае адміністраванне, зрабіць кодэкс простым і зразумелым. Акрамя таго, у ім рэалізаваны і шэраг сістэмных мер, накіраваных на зніжэнне падатковай нагрузкі, што ў сваю чаргу стане дадатковым стымулам для прыцягнення інвестыцый, стварэнне новых рабочых месцаў, рэінвеставанне прыбытку ў развіццё вытворчасці. У гэтым жа кірунку стаіць задача стварыць найлепшыя ўмовы для інвестыцый у ЕАЭС.

Гаворачы пра экспарт, Сяргей Румас звярнуў увагу на праблему шырокай прысутнасці на адным рынку. Сярод асноўных задач у гэтай сферы ён адзначыў забеспячэнне да канца пяцігодкі роўнага размеркавання таварных экспартных паставак паміж рынкамі ЕАЭС, ЕС і краін дальняй дугі.

Прэм'ер-міністр падрабязна спыніўся на мерах і задачах у кожнай галіне. Напрыклад, да канца пяцігодкі тэмп экспарту сельскагаспадарчай прадукцыі і прадуктаў харчавання павінен вырасці на трэць у параўнанні з 2017 годам.

Надзея АНІСОВІЧ.

Варта ведаць

ШТО ЗМЕНІЦЦА Ў ЛІСТАПАДЗЕ

У Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны паведамілі пра тое, як з пачатку апошняга асенняга месяца ў краіне зменяцца дзяржаўныя выплаты для пенсіянераў, сем'яў з дзецьмі і людзей з інваліднасцю, а таксама крытэрыі патрэбнасці пры вызначэнні права на дзяржаўную адрасную сацыяльную дапамогу.

Працоўныя пенсіі павысяцца

У нашай краіне з 1 лістапада павышаюцца працоўныя пенсіі, у сярэднім на 5,3 %. Чакаецца, што сярэдні памер працоўных пенсій вырасце да 388,1 рубля, а сярэдні памер пенсіі па ўзросце — да 393,96 рубля. У гэтым годзе працоўныя пенсіі беларусаў ужо павышаліся двойчы — з 1 мая і 1 жніўня. У цэлым, як адзначаюць у Мінпрацы, у выніку зробленых у гэтым годзе пераразлікаў працоўныя пенсіі павялічацца на 22 %.

Вырастуць бюджэт пражытковага мінімуму і дзіцячыя дапамогі

З 1 лістапада вырасце бюджэт пражытковага мінімуму (БПМ) і, адпаведна, паднімуцца мінімальныя працоўныя і сацыяльныя пенсіі, некаторыя дзіцячыя дапамогі, прывязаныя да БПМ, а таксама зменяцца мінімальныя спажывецкія бюджэты.

Бюджэт пражытковага мінімуму ў лістападзе складзе 214,21 рубля. Ён будзе дзейнічаць да канца студзеня 2019 года.

Павелічэнне БПМ адаб'ецца і на аднаразовай дапамозе ў сувязі з нараджэннем першага дзіцяці, якая цяпер будзе раўняцца 2142,7 рубля, пры нараджэнні другога і наступных дзяцей памер аднаразовай дапамогі складзе 2998,94 рубля. Аднаразовая дапамога жанчынам, якія сталі на ўлік у дзяржаўных арганізацыях аховы здароўя да 12-тыднёвага тэрміну цяжарнасці, складзе 214,21 рубля.

Дапамога сем'ям на дзяцей ва ўзросце ад 3 да 18 гадоў у перыяд выхавання дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў (штомесячная) складзе 107,11 рубля.

Дапамога на дзяцей, старэйшых за 3 гады, з асобных катэгорый сем'яў, прадугледжаных заканадаўствам (штомесячная):

— на дзяцей, старэйшых за 3 гады, якія выхоўваюцца ў такіх сем'ях (акрамя дзіцяці-інваліда), — 107,11 рубля;

— на дзіця-інваліда, старэйшага за 3 гады, — 149,95 рубля.

Дапамога па доглядзе дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў (штомесячная):

— з I і II ступенню страты здароўя да спаўнення дзіцяці 18 гадоў і з III і IV ступенню страты здароўя да спаўнення дзіцяці 3 гадоў — 214,21 рубля;

— з III і IV ступенню страты здароўя пасля спаўнення дзіцяці 3 гадоў — 257,05 рубля;

— дапамога на дзяцей ва ўзросце да 18 гадоў, інфіцыраваных вірусам імунадэфіцыту чалавека (штомесячная), складзе 149,95 рубля.

Павялічацца памеры мінімальных спажывецкіх бюджэтаў

Таксама з лістапада ўстаноўлены новыя памеры мінімальных спажывецкіх бюджэтаў (МСБ) для розных сацыяльна-дэмаграфічных груп:

для працаздольнага насельніцтва — 446,02 рубля;

для пенсіянераў — 349,35 рубля;

для студэнтаў — 328,98 рубля;

для дзяцей ва ўзросце да трох гадоў — 282,23 рубля;

для дзяцей ва ўзросце ад трох да шасці гадоў — 365,35 рубля;

для дзяцей ва ўзросце ад шасці да васемнаццаці гадоў — 379,23 рубля;

для сям'і з чатырох чалавек — 347,74 рубля;

для маладой сям'і з трох чалавек — 377,03 рубля.

Гэтыя памеры мінімальных спажывецкіх бюджэтаў будуць дзейнічаць да 31 студзеня 2019 года.

Святлана БУСЬКО.

Блізкая ўлада

Прадстаўнікі Адміністрацыі Прэзідэнта правядуць выязныя прыёмы

Кіраўніцтва і службовыя асобы Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі правядуць у лістападзе выязныя прыёмы грамадзян і юрыдычных асоб у рэгіёнах, паведамляе БелТА.

Так, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта **Мікалай СНАПКОЎ 9 лістапада** сустрэнецца з жыхарамі рэгіёна ў **Быхаўскім райвыканкаме.**

Першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб — начальнік упраўлення пісьмовых і электронных зваротаў **Крысціна ПОБАЛЬ** правядзе прыём у **Карэліцкім райвыканкаме 1 лістапада.**

Начальнік галоўнага ўпраўлення па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб **Рыгор ШЛЫК** прыме грамадзян у **Клецкім райвыканкаме 2 лістапада.**

На 5 лістапада ў Столінскім райвыканкаме запланаваны прыём намеснікам начальніка галоўнага ўпраўлення па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб — загадчыкам асабістым прыёмам **Ігарам ЛАМАНОСАВЫМ**.

У Талачынскім райвыканкаме 6 лістапада адбудзецца прыём грамадзян намеснікам начальніка галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення — начальнікам упраўлення ідэалогіі і інфармацыйнай палітыкі **Наталляй МАРЧАНКА.**

Намеснік начальніка галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення — начальнік упраўлення сацыяльнай палітыкі **Наталля КРАСАЧКА 8 лістапада** правядзе прыём у **Баранавіцкім гарвыканкаме.**

Выязны прыём у **Касцюковіцкім райвыканкаме** правядзе **9 лістапада** намеснік начальніка ўпраўлення пісьмовых і электронных зваротаў галоўнага ўпраўлення па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб **Аляксей БАБІЦКІ**.

Запісацца на прыём можна па тэлефонах аддзелаў па рабоце са зваротамі грамадзян адпаведных выканаўчых камітэтаў.

Усе мерапрыемствы адбудуцца з 10.00 да 13.00. Праблемы будуць разглядацца і вырашацца як на месцы, так і, у выпадку неабходнасці, пасля прыёму з прыцягненнем рэспубліканскіх органаў кіравання.

СКРАЎ ГРОШЫ НА АПЕРАЦЫЮ

Пацярпелы збіраў іх пяць гадоў

Супрацоўнікі крымінальнага вышуку Мінскага АУС на транспарце шукаюць мужчыну, які скраў кашалёк, дзе знаходзілася 1990 рублёў і 290 долараў. Гэтыя грошы пацярпелы збіраў пяць гадоў на аперацыю. Момант крадзяжу зафіксавала камера відэаназірання.

55-гадовы мужчына прыехаў з Гомельскай вобласці ў адзін з медыцынскіх цэнтраў сталіцы на аперацыю па выдаленні катаракты. У Мінск пацярпелы дабраўся на рэйсавым аўтобусе, і ў яго да прызначанага прыёму ва ўрача яшчэ заставаўся час. Грамадзянін вырашыў, што менавіта ў гэты дзень крыху алкаголю яму не зашкодзіць, і ў двары жылога дома па вуліцы Кірава мужчына стаў выпіваць каньяк. Падазраваны, якога цяпер шукаюць, у той момант знаходзіўся ў тым жа двары. Мужчыны пазнаёміліся, разгаварыліся. Потым разам выпілі і пацярпелы перабраў са спіртным. Гэтым скарыстаўся зламыснік. З сумкі ён скраў кашалёк, у якім былі грошы на аперацыю. Прапажа кашалька выявілася толькі на вакзале.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Неспрыяльныя дні і гадзіны ў лістападзе

1, чацвер, 6.30 – 8.00
4, нядзеля, 9.30 – 11.00
6, аўторак, 10.30 – 15.00
8, чацвер, 12.30 – 21.00
13, аўторак, 17.30 – 18.00
16, пятніца, 6.00 – 7.30
18, нядзеля, 10.00 – 18.00
20, аўторак, 22.00 – 24.00
22, чацвер, 14.30 – 24.00
23, пятніца, 0.00 – 6.00
25, нядзеля, 7.30 – 9.00
27, аўторак, 9.30 – 11.00
29, чацвер, 12.00 – 13.30

ДАРОЖНІКІ ДА ЗІМЫ ГАТОВЫЯ

Галоўнае — бяспека і экалогія

Асноўная ўвага дарожных арганізацый перад пачаткам зімовага перыяду аддаецца падрыхтоўцы вытворчых баз, дарожна-будаўнічай тэхнікі, а таксама процігалалёдным матэрыялам, адзначыў намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення аўтамабільных дарог Міністэрства транспарту і камунікацый Сяргей ЛЯВОНЧЫК.

— У гэтым годзе мы ў планавым рэжыме падрыхтавалі 345 тысяч тон пясчана-саляной сумесі, 183,5 тысячы тон тэхнічнай солі і 122 тысячы тон чыстай солі. Акрамя таго, вядзецца нарыхтоўка арганамінеральных сумесяў, якія ў зімовы перыяд выкарыстоўваюцца ў аварыйных выпадках для ямачнага рамонту, — паведаміў прадстаўнік Мінтранса. Для барацьбы з галалёдзіцай будуць прымяняцца традыцыйныя метады.

Таксама ён дадаў, што функцыянуе адзіны кароткі нумар 125 дыспетчарскіх службаў арганізацый дарожнай гаспадаркі. Набраўшы яго ў любым рэгіёне краіны, удзельнікі дарожнага руху могуць паведаміць важную інфармацыю альбо выказаць прэтэнзіі з нагоды дарожных умоў. Калі атрыманая інфармацыя адносіцца да кампетэнцыі дарожных службаў рэспубліканскай дарожнай гаспадаркі, яна не застанецца без увагі і адпаведнага рэагавання. Акрамя таго, пры неабходнасці да вырашэння праблемы будуць прыцягнутыя іншыя экстранныя і аварыйныя службы.

Пры цяперашнім надвор'і, калі адбываюцца рэзкія змены тэмпературнага рэжыму, асабліва востра паўстае пытанне бяспекі. Адлігі і замаразкі, якія мяняюцца, аказваюць кардынальны ўплыў не толькі на стан праезнай часткі, але і на сам транспартны сродак.

Некалькі слоў для пешаходаў, бо ім таксама пагражае небяспека на слізкай дарозе. Набліжаючыся да краю праезнай часткі, варта звярнуць увагу на стан бардзюрнага каменю — ён можа быць абледзянелы. Асабліва варта быць пільнымі ў дварах — лавіруючы паміж прыпаркаванымі аўтамабілямі, можна паслізнуцца і трапіць пад колы.

А вось снег з мінскіх вуліц гэтай зімой будуць вывозіць на дзесяць пляцовак. Таксама арганізуюць работу снегаплавільнага пункта, паведаміў **намеснік генеральнага дырэктара па ўтрыманні аб'ектаў добраўпарадкавання ДВА «Гаррамаўтадар Мінгарвыканкама» Алег ЛУКАШЭНКА.**

Тэхналогію, якая дазволіць мінімізаваць уздзеянне процігалалёдных сумесяў на зялёныя насаджэнні ўздоўж гарадскіх вуліц, плануюць выкарыстоўваць у Мінску. Як адзначыў Алег Лукашэнка, «Гаррамаўтадар» глыбока заклапочаны праблемамі экалагічнай абстаноўкі сталіцы, якія звязаныя з хваробамі і гібеллю дрэў уздоўж магістральных вуліц. Таму ў гэтым годзе аб'яднанне наладзіла супрацоўніцтва з Інстытутам мікрабіялогіі НАН Беларусі ў рамках праграмы «Інавацыйныя біятэхналогіі — 2020».

У выніку супрацоўніцтва распрацавана і будзе ўкараняцца тэхналогія прымянення мікробных угнаенняў на аснове солеўстойлівых, азотфіксуючых мікраарганізмаў, якая дапаможа справіцца з наступствамі забруджвання гарадскіх глебаў хлорыстым натрыем. Тэхналогія павысіць захаванасць драўняна-хмызняковых раслін уздоўж гарадскіх вуліц.

Сяргей КУРКАЧ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Mirror: прынц Чарльз можа стаць каралём Вялікабрытаніі праз тры гады

Каралева Вялікабрытаніі Лізавета II плануе перадаць праўленне старэйшаму сыну — прынцу Уэльскаму Чарльзу. Наследнік можа ўзысці на брытанскі трон праз тры гады, паведаміла ў сераду газета Daily Mirror. Пры гэтым, як сцвярджае выданне, Яе Вялікасць «мае намер зрабіць наследніка прынцам-рэгентам». Гэта азначае, што «Чарльз стане каралём ва ўсіх сэнсах гэтага слова, аднак фармальна Лізавета II працягне служыць свайму народу да самай смерці», гаворыцца ў матэрыяле.

Згодна з заканадаўчым дакументам рэгент павінен быць старэйшы за 21 год, мець брытанскае падданства і пражываць на тэрыторыі Злучанага Каралеўства. Так, паводле гэтых правіл, адзіным рэгентам быў Георг IV, які кіраваў з 1810-га па 1820 год, пасля таго як сур'ёзна захварэў яго бацька Георг III.

Лізавета II уступіла ў правы манарха ў 1952 годзе ва ўзросце 25 гадоў. У верасні 2015 года яна перасягнула рэкорд каралевы Вікторыі па працягласці знаходжання на троне, а пасля таго як 13 кастрычніка 2016 года памёр кароль Тайланда Пуміпон Адульядэт, Лізавета стала манархам, які кіруе даўжэй за іншых манархаў свету. 21 красавіка гэтага года яна адсвяткавала свой 92-і дзень нараджэння.

Еўрапейскія краіны заклікалі Расію спыніць выбары кіраўніка ДНР

Прадстаўнікі Брытаніі, Францыі, Германіі, Бельгіі, Італіі, Нідэрландаў, Швецыі і Польшчы асудзілі «незаконныя выбары» на паўднёвым усходзе Украіны, запланаваныя на 11 лістапада, і заклікалі Расію «аказаць свой уплыў, каб спыніць» іх. Заява была зроблена напярэдадні пазачарговага пасяджэння Савета Бяспекі ААН па Украіне. Як паведамляе ТАСС, яны таксама абвінавачвалі Маскву ў «фінансаванні і ваеннай падтрымцы сепаратыстаў».

У першыя хвіліны пасля пачатку работы Савета Бяспекі пастаянныя прадстаўнікі заходніх краін прагаласавалі супраць выступлення кіраўніка Цэнтральнай выбарчай камісіі ЛНР з дакладам пра сітуацыю ў рэспубліцы. «Гэты дакладчык не прадстаўляе ні законныя ўлады Украіны, ні яе грамадзянскую супольнасць, таму яго прысутнасць створыць небяспечны прэцэдэнт», — агучыў меркаванне прадстаўнік Швецыі пры ААН Карл Скау.

На 11 лістапада прызначаны выбары кіраўніка самаабвешчанай Данецкай народнай рэспублікі, якія пройдуць пасля гібелі 31 жніўня ў выніку выбуху ў Данецку ранейшага кіраўніка ДНР Аляксандра Захарчанкі. Часова выконваючым абавязкі кіраўніка ДНР стаў Дзяніс Пушылін, ён таксама падаў дакументы для ўдзелу ў выбарах.

Зонд НАСА «Паркер» пабіў рэкорд скорасці і блізкасці да Сонца

Місія НАСА, адпраўленая да Сонца два з лішнім месяцы таму, наблізілася да нашай зоркі на рэкордна блізкую адлегласць — і працягвае рух. Папярэдні рэкорд належаў сумеснаму амерыкана-германскаму спадарожніку «Гелиос-2»: у 1976 годзе той наблізіўся да Сонца на 42,73 млн км. «Паркер», задача якога — «дакрануцца да Сонца», праляцеўшы скрозь сонечную карону, павінен падляцець да зоркі прыкладна ў сем разоў бліжэй. У пункце найбольшага набліжэння апарат будзе аддзяляць ад паверхні свяціла ўсяго 6 млн км — гэта ў 25 разоў бліжэй, чым арбіта нашай планеты. Адначасна «Паркер» устанавіў і новы рэкорд скорасці для аб'екта, калі-небудзь створанага рукамі чалавека: каля 70 км/с. Але і гэты рэкорд таксама пратрымаўся нядоўга: па меры набліжэння да Сонца апарат працягвае паскарацца, і, згодна з разлікамі, яго пікавая скорасць складзе каля 190 км/с (прыкладна 680 тысяч км/г).

Ёсць у місіі і зусім практычны сэнс. Вучоныя спадзяюцца, што пры дапамозе гэтага даследавання яны змогуць лепш зразумець прыроду сонечнага ветру і, магчыма, навучацца прадказваць касмічнае надвор'е, ад якога на Зямлі залежыць многае.

Блізкая ўлада

НЕ БЫВАЕ ДРОБЯЗНЫХ ПЫТАННЯЎ

Крыху больш як год Ігар Яўсееў займае пасаду памочніка Прэзідэнта — інспектара па Мінскай вобласці. За гэты тэрмін Ігар Уладзіміравіч выслухаў падчас правядзення асабістых прыёмаў 50 грамадзян. На чарговую сустрэчу ў Беразіно прыйшло пяць заяўнікаў, у тым ліку і з суседніх раёнаў. У асноўным людзей хвалявалі праблемы зямельных узаемаадносін.

Фота БелТА.

Жыхарка сталіцы Ірына Віктараўна прыйшла ад імя сваёй маці — члена садовага таварыства «Верас-91», што знаходзіцца ў Лагойскім раёне. Справа ў тым, што суседка самавольна захапіла частку зямлі, якая належыць жанчыне. Па рашэнні суда Лагойскі райвыканкам сумесна з праўленнем таварыства павінны вызначыць межы ўчастка згодна з генеральным планам. Але пытанне да гэтага часу не вырашана. Як сцвярджала заяўніца, члены садовага таварыства на гэта не пойдуць, паколькі такія крокі патрабуюць дадатковых грашовых затрат. Акрамя таго, яна ў 2017 годзе за асабістыя сродкі зрабіла карэкціроўку фрагмента генплана. Але дакумент не лічыцца сапраўдным.

Начальнік упраўлення землеўпарадкавання Лагойскага райвыканкама Ілья Дашкевіч растлумачыў, што пытанне неабходна вынесці на абмеркаванне агульнага сходу членаў садовага таварыства. Яны і прымуць рашэнне: праводзіць або не карэкціроўку. Пасяджэнне было прызначана на 10 кастрычніка, але не ўдалося сабраць кворум.

— Карэкціроўку можна зрабіць за кошт зямель агульнага карыстання. Ды супраць гэтага таварыства і ўласнік сумежнага ўчастка. Я згодна, таму што ўсё надакучыла, хочацца хутчэй вырашыць праблему, — кажа заяўніца.

— Магчыма, мы ў рабочым парадку выедзем на месца, збяром вас, кіраўніка садовага таварыства, землеўпарадкавальную службу, спецыялістаў і, выслухаўшы ўсе зацікаўленыя бакі, прымем калегіяльнае рашэнне, каб нарэшце паставіць кропку ў гэтай сітуацыі. Акрамя таго, я вывучу дакументы дадаткова, — супакоіў жанчыну Ігар Яўсееў.

Браты Рудзько з Салігорскага раёна — фермеры. Яны паскардзіліся на кіраўніцтва мясцовай гаспадаркі, якое загадала задыскаваць іх поле, дзе была пасаджана бульба. Фермеры патрабавалі, каб сельгасарганізацыя кампенсавала ім панесеныя ў выніку страты.

Начальнік аддзела землеўпарадкавання Салігорскага райвыканкама Ірына Навумчык сцвярджала, што фермераў папярэджвалі, каб не засявалі поле, паколькі яно неабходна гаспадарцы для сваіх мэт. Узамен ім выдзелілі іншы ўчастак. Аднак браты не згадзіліся.

На думку Ігара Яўсеева, ім неабходна выдзеліць столькі зямлі, колькі патрабуецца для абслугоўвання сялянскай фермерскай гаспадаркі. «Пра тое, што мужчыны любяць зямлю і добрасумленна на ёй працуюць, сведчаць іх мазолістыя рукі. Такіх гаспадароў трэба падтрымліваць», — лічыць Ігар Уладзіміравіч.

Сяргей Аляксандравіч, жыхар раёна, ужо каторы год канфліктуе з суседзямі. А каменем спатыкнення стала дубліруючая агароджа, якую яны нібыта ўшчыльную паставілі да яго плота. Цяпер, па словах заяўніка, ён не можа ні пафарбаваць яго, ні падрамантаваць. Але, па заключэнні спецыялістаў аддзела архітэктуры і будаўніцтва райвыканкама, адваротны бок нічога не парушыў. Гэтыя нормы, паводле заканадаўства, не рэгламентуюцца. Разам з тым мужчына працягвае шукаць шляхі, як паставіць на месца суседзяў. Відэасюжэт пра гэтую няпростую сітуацыю паказалі падчас прыёму. Як сцвярджаюць суседзі, яны вымушаны былі адгарадзіцца ад скандальнага мужчыны. Шмат гадоў ён не дае ім спакойна жыць, паставіў відэарэгістратары, каб назіраць за чужым жыццём, устанавіў петлі з вяроўкі на сваім плоце, каб лавіць суседскіх жывёл. Ледзьве ўдалося выратаваць хатняга любімца — сабаку, які трапіў у гэтую пастку. Акрамя таго, дом Сяргея Аляксандравіча «ўпрыгожаны» выявай Бабы Ягі, чорнымі крыжамі. Жудасна, так і хочацца адгарадзіцца ад такога відовішча не проста плотам, а высокай сцяной.

Суд вынес рашэнне не на карысць Сяргея Аляксандравіча. «Адзінае, што я магу, гэта ўзяць сітуацыю пад кантроль», — запэўніў Ігар Уладзіміравіч.

Муж Іны Мікалаеўны, таксама мясцовай жыхаркі, загінуў на вытворчасці, з ім яны былі зарэгістраваны па розных адрасах. Таму ёй не выдаюць даведку аб сумесным пражыванні, неабходную для атрымання дапамогі з прычыны страты карміцеля.

— Я разумею, што цяпер галоўнае — дачакацца экспертызы. А я са свайго боку зраблю запыт у адпаведныя арганізацыі, у інспекцыю па працы і вазьму пытанне на асабісты кантроль, — паабяцаў памочнік Прэзідэнта.

— Выезд на месца дазваляе ацаніць сітуацыю, выслухаць абодва бакі і прыняць рашэнне. Ёсць пытанні, якія, на першы погляд, здаюцца нязначнымі і могуць быць вырашаны на мясцовым узроўні. Але, калі чалавек звяртаецца ў вышэйшыя інстанцыі, то для яго яны жыццёва важныя, — сказаў пасля прыёму грамадзян Ігар Яўсееў. — Кіраўнік дзяржавы нацэльвае нас, каб зняць праблему, якой бы дробязнай яна ні была. Найбольш нараканняў на якасць дарог. Гэтае пытанне на кантролі кіраўніцтва Мінаблвыканкама. Цяпер выдзелена значна больш грошай, чым у мінулыя гады, на іх уладкаванне ў Мінскім раёне і вобласці. Цягам часу дарогі будуць толькі паляпшацца, адпавядаць усім патрабаванням.

Ігар Яўсееў не толькі прыняў грамадзян, але азнаёміўся з ходам палявых работ у раёне, наведаў сельгасарганізацыі. «Мне прыемна, што на Міншчыне ўсё ідзе ў планавым парадку, да сёмага лістапада будзе ўбрана кукуруза на зерне, цукровыя буракі. Актыўна вывозіцца арганіка на палі, ідзе ворыва, закуплены магутныя трактары беларускай вытворчасці з неабходным абсталяваннем да іх, што дае свае вынікі», — адзначыў Ігар Яўсееў.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

ЯК ПАДЛІЧЫЦЬ БАЛЫ НА ЦТ?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Я пастараюся максімальна даступна выкласці сутнасць новай методыкі і адказаць на пытанні, якія ўжо ўзніклі, — паабяцаў **дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Юрый МІКСЮК.**— Усё, што мы робім, накіравана на тое, каб цэнтралізаванае тэсціраванне стала яшчэ больш аб'ектыўным і яшчэ больш празрыстым. Мы адначасова вырашалі дзве праблемы. Першая — укараненне методыкі, якая давала б ацэнку ведаў у абсалютнай велічыні, гэта значыць, стала б больш аб'ектыўнай. Ранейшая рэйтынгавая методыка не дазваляла супаставіць узровень ведаў, прадэманстраваных абітурыентам на ЦТ, з яго школьнымі ведамі. Новая методыка дазваляе зняць псіхалагічны бар'ер, які ўзнікаў у абітурыентаў пасля атрымання нізкіх балаў. Напрыклад, 12 балаў на ЦТ — гэта не рэальны ўзровень ведаў абітурыента, а яго рэйтынгавая ацэнка за выкананне канкрэтнага тэста.

Раней, чым больш абітурыентаў ведалі нейкі раздзел вучэбнай праграмы і, адпаведна, рашалі задачу з гэтага раздзела, тым меншы ўклад у агульны тэставы бал уносіла такая задача, а каштоўнасць заданняў, з якімі спраўляліся ўсе, набліжалася да нуля, і фактычна гэтыя веды не ацэньваліся і не ўлічваліся.

Цяпер кожнаму заданню прысвойваецца першасны бал. Першасныя балы будуць вядомыя яшчэ да пачатку экзамену. А вось далей пачынаюцца самыя складаныя і незразумелыя для большасці матэматычныя падлікі. Па выніках статыстычнай апрацоўкі работ усіх удзельнікаў, першаснаму балу будзе прысвойвацца каэфіцыент, а далей вылічвацца адпаведныя тэставыя балы. На жаль, журналістам разабрацца з гэтымі падлікамі

не ўдалося. Як разлічваецца згаданы каэфіцыент? Чаму да заданняў з аднолькавымі першаснымі балами прымяняюцца розныя каэфіцыенты? Як абітурыент, які выконвае толькі трэцюю частку тэста, набірае балы ў дыяпазоне 50—60? Адразу ўзнікаюць пытанні, а ў чым заключаецца празрыстасць новай сістэмы? Зараз з боку педагогаў гучаць прапановы ўвогуле адмовіцца ад ранжыравання і выкарыстоўваць толькі першасныя балы, якія ў суме будуць даваць 100.

— Не трэба вынаходзіць веласіпед, калі ўжо ёсць аўто, — парыруе Юрый Міксюк. — Для тых, хто сур'ёзна цікавіцца гэтым пытаннем, трэба глыбей пагрузіцца ў тэму. Вымярэнне ведаў — працэс, якім спецыялісты займаюцца ўжо даўно, і тое, што мы прапануем, гэта не наша ноу-хау, а дзесяцігоддзямі адпрацаваная методыка, якая прымяняецца ў шэрагу краін: у ЗША, Германіі, Аўстраліі, Швецыі, Швейцарыі, Канадзе, Фінляндыі і іншых. Нельга спыняцца на першасных балах, трэба праводзіць іх нармалізацыю. Гэта вядомы ў свеце факт. Якой бы прывабнай ні была простая методыка, калі мы вымяраем веды толькі першасным балам, гэта лічба не адлюстроўвае рэальныя веды... Я вас запэўніваю, што ад новай методыкі ўсе толькі выйграюць, ніхто не прайграе.

Для таго, хто прэтэндуе на максімальны тэставы бал, запэўніваюць арганізатары ЦТ, нічога не зменіцца. Ім па-ранейшаму трэба будзе даць правільныя адказы на ўсе заданні. Пасля 70—75 балаў, што ранейшая, што новая методыка дае аднолькавы вынік. Тыя, хто паказваў найлепшыя веды, будуць мець і больш высокія балы. А вось сітуацыя ў вобласці нізкіх і сярэдніх балаў зменіцца. Там тэставыя балы павысяцца. Але не трэба баяцца, што абітурыенты з горшымі ведамі будуць наступаць ім на пяткі... Як запэўнівае Юрый Міксюк, 50 балаў па новай методыцы — гэта няшмат, і прапануе падзяліць гэту лічбу на 10, каб супаставіць вынік ЦТ са школьнай адзнакай. Але калі прымяняць такія падлікі, то атрымліваецца, што ўсе школьныя выдатнікі, каб пацвердзіць свае школьныя адзнакі, цяпер павінны набіраць на ЦТ ад 80 да 100 балаў? Ці магчыма такое?

Не зменіцца і сітуацыя з прахаднымі балами на самых прэстыжных спецыяльнасцях, дзе яны ўжо наблізіліся да максімальнай планкі ў 400 балаў. А вось на спецыяльнасцях, дзе прахадныя балы былі ў дыяпазоне ад 100 да 200, прахадная планка, канешне, павысіцца. Затое «вага» атэстата ў агульнай суме балаў (тры сертыфікаты плюс атэстат) цяпер змяншаецца...

— Новая методыка — гэта класічны навуковы падыход, — сцвярджае Юрый Міксюк. — Журналісты — не спецыялісты, простыя людзі — таксама. Але мы павінны пераканаць усіх у тым, што гэта надзейны, аб'ектыўны і сумленны спосаб ацэнкі ведаў. Значыць, будзем працаваць са спецыялістамі, якія займаюцца тэсталогіяй, каб яны знайшлі дадатковыя аргументы...

Атрымліваецца, што ўсе школьныя выдатнікі цяпер павінны набіраць на ЦТ ад 80 да 100 балаў?

Абітурыентам 2019 года трэба рыхтавацца да павышэння мінімальнага парога. Які ён будзе, Юрый Міксюк пакуль сказаць не змог. Можа быць, 20, 30 ці 40 балаў? Гэта рашэнне будзе прымацца пазней. Але тым, у каго летась былі нізкія балы, неабходна пра гэта памятаць. Хутчэй за ўсё, леташнія сертыфікаты ўжо нікому не спатрэбяцца, таму што ў абітурыентаў 2019 года будуць значна больш высокія балы... Галоўнае — каб не засталося сумненняў, але наперадзе яшчэ два этапы рэпетыцыйнага тэсціравання. Між іншым, на бясплатным дыстанцыйным тэсціраванні пакуль заданні не абнаўляліся. Гэта абяцаюць зрабіць бліжэй да новага года, і толькі пасля іх абнаўлення там пачне прымяняцца новая сістэма падліку балаў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Факт

ВАРЫЯТЫЎНАСЦЬ АДУКАЦЫІ

Рэктар Акадэміі кіравання анансаваў змены ў працэсе паступлення

Адно з новаўвядзенняў правілаў прыёму на будучы год — абавязковая прафесійная гутарка. Таксама ў Акадэміі рыхтуюць праект Указа Прэзідэнта з новай рэдакцыяй статута, які дазволіць навучальнай установе прапанаваць варыятыўны характар падрыхтоўкі спецыялістаў.

Аб яго прынцыпах расказаў **рэктар Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Генадзь ПАЛЬЧЫК:**

— У Акадэміі кіравання ўжо была практыка, калі набор у спецыялізаваныя групы ажыццяўляўся са старшакурснікаў іншых універсітэтаў. Гэтыя групы навучаліся па спецыяльных адукацыйных планах, праграмах. Навучэнцы атрымлівалі практыкаарыентаваную фундаментальную адукацыю ў сферы, у якой плануюць працаваць. Падрыхтоўка суддзяў — гэта адно, супрацоўнікаў следчага камітэта — зусім іншае. Цяпер мы гаворым аб фарміраванні груп, якія ўжо на першай ступені адукацыі практыкаарыентаваныя на спецыфіку прававой работы ў пэўным дзяржаўным органе. Разглядаем як перспектыву магчымасць навучання ў Акадэміі кіравання па скарочаным курсе выпускнікоў спецыялізаваных каледжаў. Акадэмія кіравання прапаноўвае такі варыянт для тых выпускнікоў, якія гатовы праявіць свае кіраўніцкія навыкі.

Марыя ДАДАЛКА.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

1 ЛІСТАПАДА 2018 г.
ЧАЦВЕР
№ 21 (15852)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Адкрываем імёны

Мікіта ЦВЯТКОЎ:

«КРЭМ З ШАЛУПІННЯ — ВЕЛЬМІ СМАЧНА!»

Пра гэтага ўдзельніка чэмпіянату WorldSkills-2015 у Бразіліі мы ўжо пісалі. Тая размова адбылася якраз напярэдадні яго паездкі ў Сан-Паўлу. На той момант Мікіта Цвяткоў, амаль ужо дыпламаваны выпускнік Магілёўскага ўніверсітэта харчавання, працаваў кухарам у адным з прэстыжных рэстаранаў абласнога цэнтра і думаў пра нешта сваё, звязанае з аўтарскай кухняй. Яго мара напалову здзейснілася. Мікіта Цвяткоў запатрабаваны спецыяліст не толькі ў Магілёве, але і ў Мінску. І, што асабліва каштоўна, ён развівае айчынную беларускую кухню — на сучасны лад.

У РЭСТАРАН ПА... БІЛЕЦЕ

А што вы думалі? Магчыма, для Беларусі гэта яшчэ навінка, а вось для еўрапейцаў — справа звыклая. І Мікіта прывівае такую традыцыю магіляўчанам. Вось ужо другі год ён працуе шэфповарам магілёўскага бара і распрацоўвае для яго наведвальнікаў эксклюзіўныя віды страў. «Мы спецыялізуемся на добрым віне і карыснай беларускай ежы», — падкрэслівае суразмоўнік. Гляджу ў меню — рызота з труфельным алеем, равіёлі з грыбамі, — і мне падаецца, што з мяне жартуюць.

— Ніякага падману, — усміхаецца суразмоўнік. — Няхай гэтыя назвы вас не бянтэжаць. І рыс, і пельмені для беларусаў не такія ўжо і заморскія прадукты. Проста рыс мы варым па тэхналогіі італьянскага рызота, каб захаваць цэласнасць крупінак.

Раз на квартал Мікіта са сваёй камандай стварае сапраўднае свята для гурманаў — аўтарскія вячэры, тыя самыя, на якія прадаюцца білеты. Гэта свайго роду вынік кухарскіх эксперыментаў. Напрыклад, у восеньскім меню такой вячэры каля дзесяці пазіцый розных страў. Чаго варта толькі адна з іх — пячыста. Мяса для яго запякаецца ў печы, а сама страва гатуецца на працягу чатырох дзён. Туды яшчэ ўваходзяць лясныя грыбы, соус, які варыцца тры дні. У меню таксама ікра з гарэлкі і расолу, бульбяная каша, цукеркі з чарнаплоднай рабіны.

(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)

Пазнаёміцца з прафесіяй

ШЧАСЦЕ ТВАРЫЦЬ,

або Стыльна жыць не забароніш

Вольга ДЗМІТРЭНКА — малады спецыяліст у сферы прыгажосці. У 21 год дзяўчына ўпэўнена, што выбрала прафесію па душы. Яна працуе ў прэстыжным сталічным салоне цырульнікам-візажыстам, прымае ўдзел у розных праектах, фотасесіях, знаёміцца з мэтанакіраванымі людзьмі, падобнымі на яе. Да таго ж Вольга — увасабленне жаноцкасці і вытанчанасці. Таму не дзіўна, што пагутарыць пра цікавую прафесію стыліста мы вырашылі менавіта з ёй.

— Жаданне стаць ім прыйшло ў шостым-сёмым класе, калі я заблытала грэбень у валасах сваёй сяброўкі і мне прыйшлося выстрыгчы ёй амаль паўгрывы. *(Усміхаецца.)* Пасля, бліжэй да восьмага класа, я вызначылася, што хачу звязаць сваё жыццё з цырульніцкім майстэрствам. Матывавала дапамога мамы, якая адкрыла мой талент — прыгожа маляваць. Для паступлення ў Мінскі дзяржаўны тэхналагічны каледж трэба было абараніць малюнак, што і атрымалася: 9 балаў былі маімі. Увайшла ў лік шчасліўчыкаў і пасля дзявятага класа пачала навучанне. Атрымала прафесію «мастак-мадэльер» (сёння «стыліст»). Лічу, што трэба прайсці менавіта такую школу, каб стаць добрым майстрам. Яшчэ трэба рэальна ацэньваць свае здольнасці. Талент павінен прысутнічаць, гэтаму нельга навучыцца. Плюс каледжа ў тым, што ты пачынаеш усё з нуля, з самой гісторыі выяўленчага мастацтва, ты пашыраеш свой кругагляд, цябе заўсёды падтрымліваюць выкладчыкі. А на навучальных курсах гэтага няма, чалавеку даюць асновы тэхнікі, стрыжак, і — ідзі працуй! У мяне зараз ёсць кліенты, якія звяртаюць вялікую ўвагу на ўстанову, у якой навучаўся майстар.

Ужо на трэцім курсе Вольга пайшла ў звычайную цырульню са звычайнымі, штодзённымі патрэбамі людзей. Не дзеля грошай, бо паслугі там былі вельмі таннымі нават па мінскіх мерках, а каб даказаць сабе, што можа. А на чацвёртым курсе яна ўжо без залішняй сарамлівасці прапанавала свае паслугі аднаму са сталічных салонаў.

(Заканчэнне на 5-й стар. «ЧЗ».)

Не вучобай адзінай

Калорыі для ведаў

Як студэнта завабіць у... сталовую

Гутарка ў студэнцкай сталовай:
— Дайце, калі ласка, дзве сасіскі...
З чаргі незадаволены вокліч:
— Ну ты шыкуеш!
— І, калі ласка, сямнаццаць відэльцаў!

Гэта, канешне, анекдот, але ў кожным жарце заўсёды ёсць часцінка праўды. Нездарма кажуць, што сапраўдны студэнт заўсёды галодны. Таму для яго важна пад'есці не толькі смачна, але і танна. Ці магчыма гэта сёння? Арганізацыю харчавання ў БДПУ вырашылі разгледзець на Савеце ўніверсітэта, куды запрасілі членаў грамадскай камісіі па кантролі за арганізацыяй і якасцю харчавання, намеснікаў дэканаў і дырэктараў інстытутаў па выхаваўчай рабоце, прадстаўнікоў прафсаюзнага і студэнцкага актыву. Кожны мог выказацца па азначанай тэме.

УНІВЕРСІТЭЦКІ ХЛЕБ

— Не сакрэт, што харчаванне студэнтаў знаходзіцца на кантролі на самым высокім узроўні. За апошнія гады было праведзена шмат праверак гандлёвых комплексаў універсітэтаў. Мы шмат працуем над тым, каб удасканаліць сістэму арганізацыі харчавання ў нашай ВНУ, прапагандуем здаровае харчаванне і здаровы лад жыцця. Але вырашылі яшчэ раз сістэмна разгледзець гэта пытанне, — падкрэсліў **рэктар БДПУ Аляксандр ЖУК**, — каб паглядзець, дзе і што яшчэ не зроблена і што трэба выправіць.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
1 11 2018 г.

Калорыі для ведаў

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Сёння ў структуры гандлёвага комплексу ўніверсітэта працуюць дзве сталовыя, дзве кавярні, шэсць буфетаў і адзін кіёск, якія размешчаны ў вучэбных карпусах і інтэрнатах студэнцкага гарадка. Паслугамі комплексу карыстаюцца ў сярэднім тры тысячы чалавек штодня. Самыя папулярныя аб'екты — сталовая № 1 у галоўным корпусе і «Наша кавярня» (вучэбны корпус № 7).

— У згаданай сталовай харчуюцца прыкладна 500 чалавек. Сярэдні чэк складае тры рублі, — паведаміла **дырэктар гандлёвага комплексу БДПУ Тамара РАЖКАВАН.** — Сталовая абсталяваная сучаснай мэбляй. Там працуюць адразу тры вузлы разліку з наведвальнікамі. Асаблівым попытам карыстаюцца такія стравы, як салата са свежай капусты, салата з марской капусты, супы малочны, ячны, расольнік, мачанка з блінамі, плоў, смажаніна, запяканка з тварагу. У сталовай працуе свой кандытарскі цэх, аснашчаны сучасным высокатэхналагічным абсталяваннем. Асартымент універсітэцкай выпечкі ведае кожны студэнт і супрацоўнік БДПУ. Адно з нашых ноу-хау — універсітэцкі хлеб, рэцэптура якога была распрацавана да стагоддзя ўніверсітэта. Мы ўвогуле аддаём вялікую ўвагу фірменным стравам, кулінарным вынаходствам, стараемся гатаваць разнастайна і смачна, як дома... Усе мелі магчымасць пачаставацца прыгатаванымі нашымі кухарамі фаршыраванымі курынымі ножкамі, рулядай з мяса птушкі, паштэтам з печані, тварожнымі батончыкамі...

Увогуле, як сведчаць даныя маніторынгу, сярэдні кошт абеду ў пунктах харчавання БДПУ ў верасні знаходзіўся ў дыяпазоне ад 1,75 да чатырох рублёў. Калі размова ідзе пра буфеты, то ад 1,5 да 2,8 рубля.

«Ні адзін удзельнік апытання не прызнаўся, што набывае чыпсы, сухарыкі ці арэшкі».

— Сёння на парадку дня стаіць цэнавы фактар, — падкрэслівае Тамара Ражкаван. — Харчаванне павінна быць не проста смачным, але і даступным. Таму ў нас адбыліся змяненні ў асартыменце страў, мы больш не ўключаем у меню каларыйныя салаты з выкарыстаннем вяндліны, сыру, яек і маянэзу, а замест іх прапануюцца салаты з агародніны. Апошнія ўключаюцца і ў комплексны абед коштам да двух рублёў. На працягу шэрагу гадоў закупка сыравіны і прадуктаў у гандлёвым комплексе праводзіцца прадумана, дагаворы заключаюцца толькі з сур'ёзнымі партнёрамі, пераважна напрамую з вытворцамі, якія імкнуцца працаваць па меншай цане. Прыярытэт аддаецца тым, хто адпускае прадукцыю своечасова, дробнымі партыямі і зніжае адпускную цану. Прадукцыю пастаўляюць больш як 30 прадпрыемстваў і арганізацый.

Кошт фарміруецца ў адпаведнасці з Інструкцыяй аб парадку фарміравання цэн на прадукцыю грамадскага харчавання, што рэалізуецца ва ўстановах адукацыі, якую Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю зацвердзіла ў жніўні гэтага года. У меню прапануюцца салаты коштам ад 20 да 90 капеек, супы коштам да 60 капеек, гарачыя стравы — ад 80 капеек да трох рублёў.

ПРА ХАРЧОВЫЯ ЗВЫЧКІ

— Маладое пакаленне, на жаль, часта не задумваецца аб наступствах сваіх няправільных харчовых паводзінаў, — разважае **першы прарэктар БДПУ Святлана КОПЦЕВА.** — Пасля паступлення ў ВНУ многія студэнты цалкам ці часткова змяняюць рэжым харчавання. У іх рацыёне змяншаецца аб'ём спажывання мяса, рыбы, малочных прадуктаў, агародніны і садавіны, затое павялічваецца спажыванне каўбасных і макаронных вырабаў, выпечкі, яек. Асабліва гэта актуальна для іншагародніх студэнтаў, якім даводзіцца самастойна клапаціцца пра арганізацыю свайго харчавання. Таксама далёка не ўсе ўмеюць кіраваць уласным бюджэтам. Негатыўнае змяненне структуры і якасці харчавання з'яўляецца адной з асноўных прычын агульнай стамляльнасці і розных захворванняў. Сітуацыю са станам здароўя маладога пакалення ніяк нельга назваць добрай. Па звестках САЗ, агульная захваральнасць студэнцкай моладзі ўзрасла за апошнія дзесяць гадоў на 35 %, у многім гэта звязана з харчовымі звычкамі.

У сувязі з гэтым у БДПУ сумесна з 33-й студэнцкай паліклінікай была зацверджана «Комплексная праграма ўмацавання здароўя студэнтаў на 2018—2021 гады», адным з напрамкаў якой з'яўляецца арганізацыя збалансаванага рацыянальнага харчавання. У цэнтры ўвагі — забеспячэнне рэгулярным гарачым харчаваннем, пашырэнне асартыменту ў сталовых універсітэта, вітамінізацыя страў, а таксама кантроль за арганізацыяй харчавання з боку рэктарата і грамадскіх арганізацый. Штогод ва ўніверсітэце праводзіцца маніторынг у гэтай сферы.

Святлана Копцева азнаёміла ўсіх з вынікамі дыстанцыйнага даследавання, якое праводзілася ў гэтым годзе супрацоўнікамі псіхалагічнай службы сумесна з цэнтрам развіцця інфармацыйных тэхналогій. Удзел у ім узялі 440 студэнтаў першых—чацвёртых курсаў, а таксама выкладчыкі і супрацоўнікі ўніверсітэта.

У ходзе даследавання, у прыватнасці, высветлілася, што кожны дзень наведваюць сталовыя і буфеты БДПУ толькі чвэрць апытаных. Некалькі разоў на тыдзень — 45 %, некалькі разоў на месяц — 25 %, а ўвогуле не наведваюць каля 5 %. Большая частка апытаных (87,3 %) у той ці іншай ступені задаволена ўзроўнем арганізацыі харчавання ў БДПУ. У найбольшай ступені студэнты задаволены якасцю абслугоўвання (86,3 %), якасцю страў (84,6 %), якасцю сталовых прыбораў (78,9 %) і графікам работы пунктаў харчавання (74,6 %).

А... ЧЫПСЫ ЁСЦЬ?

У студэнтаў і супрацоўнікаў пацікавіліся, што з ежы яны набываюць часцей за ўсё? Найбольш папулярнымі з'яўляюцца другія стравы: іх выбірае амаль палова ад усіх апытаных. Першыя стравы — 23,6 % рэспандэнтаў. Кожны дзясяты ўдзельнік даследавання аддае перавагу гарбаце ці каве ў буфетах і сталовых універсітэта. Салаты заказваюць 8,6 % ад агульнай колькасці ўдзельнікаў даследавання. Мала хто выбірае сок, газіраваную ваду, выпечку, пірожныя, а тым больш шакалад. Цікава, што ні адзін удзельнік апытання не прызнаўся, што набывае чыпсы, сухарыкі ці арэшкі.

«А чаго, на вашу думку, не хапае ў асартыментным пераліку пунктаў харчавання БДПУ?» — пацікавіліся ў студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэта.

Пашырыць асартымент першых страў папрасілі 32 % удзельнікаў апытання. Недастатковы выбар другіх страў адзначылі 16 %. Бачыць больш шырокі выбар салатаў пажадалі 12 % апытаных. Пры гэтым каля трэцяй часткі ўдзельнікаў даследавання ўказалі, што ім усяго хапае.

Усім было прапанавана выказаць заўвагі па ўдасканаленні арганізацыі харчавання ва ўніверсітэце. Несумненным лідарам сярод адказаў з'яўляецца пажаданне рэспандэнтаў унесці ў асартымент страў большую разнастайнасць «соні» бягуць у сталовую ці буфет, але за 15 хвілін перапынку вельмі праблематычна паспець праглынуць нават булачку пад кубачак кавы. Калі б перапынак быў крышачку даўжэйшы, магчыма, што нехта хоць на трэцюю пару не пайшоў бы з галодным страўнікам. Ёсць пытанні і па арганізацыі харчавання па суботах. Рэктар універсітэта паабяцаў пра гэта падумаць...

МАНТЫ З ГАРБУЗА

Дырэктар гандлёвага комплексу Тамара Ражкаван звярнула ўвагу на кадравую праблему. Для Мінскага прафесійна-тэхнічнага каледжа кулінарыі сталовыя БДПУ з'яўляюцца базавымі прадпрыемствамі для навучання і праходжання вытворчай практыкі.

— У дадзены момант на практыцы ў нас знаходзяцца восем будучых кухараў і два кандытары, — паведаміла яна. — Адтуль да нас прыходзяць па размеркаванні і маладыя спецыялісты. Але нягледзячы на вельмі прыязную і добразычлівую атмасферу ў калектыве, праз год многія з іх звальняюцца. Цякучасць кадраў складае 30 %. Кухар — увогуле складаная прафесія, якая патрабуе вялікіх фізічных намаганняў, добрага вакамера і выдатных смакавых рэцэптараў. Моладзь сутыкаецца ў нас з тым, што да дзесяці гадзін раніцы трэба ўжо вельмі шмат прыгатаваць, а яны не вытрымліваюць нагрузкі. Ідуць у кавярню ці піцэрыю, дзе за дзень можна зрабіць 10—20 піц і атрымаць такі ж заробак, як у нас, але пры іншых высілках. А падчас летніх і зімовых канікул, калі адсутнічае тавараабарот, нам увогуле даводзіцца звяртацца да кіраўніцтва ўніверсітэта па матэрыяльную падтрымку.

«Сярэдні кошт абеду ў пунктах харчавання БДПУ ў верасні знаходзіўся ў дыяпазоне ад 1,75 да 4 рублёў».

«Трэба рабіць нашы прадпрыемствы прыгожымі, сучаснымі, каб гэта прыцягвала маладое пакаленне, — адказала на пытанне рэктара, як спыніць адток кадраў, Тамара Ражкаван. — Ну і, канешне, павялічваць заработную плату...»

Святлана Копцева асобна спынілася на ўнікальным асеннім фестывалі «Гарбузовы фэст», які ў канцы верасня прайшоў на аграбіястанцыі «Зялёнае» пад Мінскам ужо другі раз. Яго ідэя — далучэнне студэнцкай моладзі да беларускай нацыянальнай культуры, а таксама прапаганда здаровага ладу жыцця і культуры здаровага харчавання. Конкурсная праграма фэсту ўключае, напрыклад, кулінарны паядынак па прыгатаванні страў з агародніны. У гэтым годзе ён называўся «Восеньскія прысмакі» і ўяўляў сабой прэзентацыю факультэцкімі камандамі не менш як дзвюх страў з гарбуза ці іншай агародніны ці садавіны.

— Трэба прызнаць, што былі прапанаваны сапраўдныя кулінарныя шэдэўры як па тэхналогіі прыгатавання, так і па крэатыўным іх афармленні і прэзентацыі: супы, другія стравы, гарніры, выпечка, напіткі, дэсерты, — адзначае першы прарэктар. — Акрамя таго, у праграме другога фестывалю адбыліся майстар-класы «Замежныя пачастункі»: студэнты з Туркменістана, Кітая і Ірака прэзентавалі стравы сваёй нацыянальнай кухні. Прадстаўнік Туркменістана, напрыклад, дэманстраваў прыгатаванне мантоў з гарбузовай начынкай непасрэдна на вуліцы, выкарыстоўваючы вогнішча і традыцыйны азіяцкі металічны казан. Быў і пачастунак ад рэктарата — каша з гарбуза, а таксама салодкія пірагі па фірменным рэцэпце гандлёвага комплексу БДПУ.

Падводзячы вынікі Савета ўніверсітэта, рэктар Аляксандр Жук адзначыў: «Тая акалічнасць, што да нас ідуць харчавацца з іншых ВНУ і іншых арганізацый, сведчыць, што мы рухаемся ў правільным кірунку. Мы бачым свае моцныя і слабыя бакі. Трэба думаць пра большы ахоп студэнтаў харчаваннем, бо ўзнікае цалкам заканамернае пытанне: а дзе харчуюцца астатнія? У 2017 годзе былі адкрыты пасля рамонту «Наша кавярня» і «Дашкольная кавярня». Цяпер ушчыльную зоймемся сталовай № 3 па вуліцы Артылерыстаў, 14 і буфетам № 4 на Магілёўскай, 37. І не будзем спыняць маніторынгі і рэйд-праверкі якасці паслуг, якія аказваюцца аб'ектамі харчавання ўніверсітэта».

Надзея НІКАЛАЕВА.
Фота прэс-службы БДПУ.

Погляд праз час

ПА СТАРОНКАХ КАМСАМОЛЬСКАГА ЮНАЦТВА...

У краіне прыгадалі самыя яркія і гераічныя з іх

Днямі ВЛКСМ адзначыў свой 100-гадовы юбілей. Камітэт па святкаванні гэтай даты ў Беларусі на дзяржаўным узроўні быў створаны задоўга да дня нараджэння некалі самай масавай маладзёжнай арганізацыі колішняй вялікай краіны. Мерапрыемствы, прысвечаныя гісторыі стварэння і развіцця ВЛКСМ, праходзілі ў Беларусі цягам усяго гэтага часу. Але іх кульмінацыя прыпала на «Камсамольскі тыдзень» непасрэдна перад самой круглай датай. Прыгадаем некаторыя імпрэзы, якія адбыліся напярэдадні 100-гадовага юбілею ВЛКСМ.

Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі — пераемнік і падаўжальнік традыцый камсамола — перад днём нараджэння свайго «старэйшага брата» даў старт маладзёжнаму марафону «Камсамолу — 100: эстафета пакаленняў».

Часткай мерапрыемства ў Рэспубліканскім доме моладзі стала мабільная экспазіцыя: калекцыя камсамольскіх білетаў і значкоў розных пакаленняў, камсамольскія курткі байцоў студэнцкіх атрадаў, выразкі з камсамольскіх газет і часопісаў, пласцінкі з камсамольскімі песнямі, фатаграфіі, плакаты, падарункі і сувеніры, уручаныя ЦК камсамола. У дзень старту марафону арганізатары праекта кінулі кліч для збору камсамольскіх экспанатаў па ўсёй краіне. Пачын быў падхоплены актывістамі Саюза моладзі ў раёнах і гарадах краіны. Яны правялі дыялогі пакаленняў, сустрэліся з камсамольцамі розных гадоў. Падчас сустрэч, а таксама пошукавай работы запісваліся гісторыі відавочцаў тых падзей, збіраліся прадметы (узнагароды, фатаграфіі і іншае), якія адлюстроўваюць гісторыю камсамольскага руху ў кожным рэгіёне.

Па ініцыятыве Мінскай гарадской арганізацыі БРСМ у сталіцы на доме з канспіратыўнай кватэрай Мінскага партыйнага падполля ў 1941—1943 гадах была адкрыта памятная шыльда.

Напярэдадні юбілейнай даты Выдавецкі дом «Звязда» па заказе і пры фінансавай падтрымцы Міністэрства інфармацыі выдаў кнігу «У рытме імклівых гадоў. Нарысы гісторыі камсамола Беларусі». На 280 старонках аўтарскі калектыў упершыню больш чым за трыццаць гадоў вырашыў прааналізаваць той шлях, які прайшла вядучая маладзёжная арганізацыя: ад перадумоў узнікнення да сённяшняга дня. Сярод тых, хто на падставе архіўных і асабістых дакументаў рыхтаваў кнігу, — вядомыя айчынныя вучоныя, публіцысты, большасць з якіх мае ўласны вопыт работы ў камсамоле і БРСМ. Першапачатковы тыраж кнігі — 2,5 тысячы экзэмпляраў, якія паступяць у продаж і бібліятэкі. Як паабяцалі аўтары, «хутчэй за ўсё, гэта толькі пачатак вялікай работы па асэнсаванні і аналізе гісторыі маладзёжнага руху ў нашай краіне. Наперадзе яшчэ не адна публікацыя і кніга». І неўзабаве было абвешчана, што калектыўную манаграфію да 100-годдзя камсамола Беларусі выдадуць да 2020 года. Гэта будзе яшчэ адна кніга, якая дазволіць найбольш поўна раскрыць гісторыю станаўлення і развіцця маладзёжнага руху ў краіне.

Урачыстая цырымонія гашэння паштовай маркі «100 гадоў камсамолу» прайшла ў Нацыянальным мастацкім музеі ў Мінску ў гэтыя ж дні. Асновай для яе стала рэпрадукцыя карціны «Партрэт студэнткі», якую ў 1971 годзе алеем на папялатне напісаў мінскі мастак Віктар Пратасеня. Марка надрукаваная ў выдавецтве «Беларускі Дом друку» тыражом у 48 тысяч.

Праект быў падрыхтаваны ў супрацоўніцтве з Нацыянальным мастацкім музеем, дзе адкрылася выстаўка «Юнацтва камсамольскае». У экспазіцыі прадстаўлена больш за 60 твораў жывапісу, графікі, скульптуры, створаных у 1920—1980-я гады, якія адлюстроўваюць гісторыю камсамольскага руху. Выстаўка павінна стаць адным з зыходных пунктаў планамернай і буйнамаштабнай падрыхтоўкі да 100-годдзя камсамола Беларусі, якое будзе адзначацца ў верасні 2020 года. Выстаўка «Юнацтва камсамольскае» будзе экспанавацца ў Нацыянальным мастацкім музеі да 25 лістапада.

Памятны знак «Студэнцкім студатрадам», прысвечаны 55-годдзю студатрадаўскага руху ў Беларусі, устанавілі ў сталіцы 26 кастрычніка. Ён заняў сваё месца на тэрыторыі Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта. Яно выбрана не выпадкова. Менавіта на базе колішняга палітэха быў сфарміраваны першы беларускі студэнцкі будаўнічы атрад. У 1963 годзе ва Уральскую вобласць Казахстана выехалі 2,5 тысячы беларускіх студэнтаў з 16 ВНУ краіны, з іх 600 студэнтаў БПІ.

Першым камандзірам Беларускага зводнага цаліннага атрада быў выпускнік Беларускага політэхнічнага інстытута Ноліс Варонін. Праз цоўны семестр доўжыўся 70 дзён. Зводны атрад удзельнічаў у будаўніцтве 362 аб'ектаў жыллёвага і культурна-бытавога прызначэння ў 41 гаспадарцы Заходне-Казахстанскага краю. У стэпе было пабудавана 100 жылых дамоў, 18 інтэрнатаў, 34 культурна-бытавыя аб'екты, 6 майстэрняў, 8 школ.

За актыўны ўдзел у трэцім працоўным семестры і дасягнутыя высокія вынікі ў рабоце камсамольская арганізацыя Беларускага політэхнічнага інстытута была занесена ў Кнігу Гонару ЦК ВЛКСМ, 16 чалавек былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі. А ў 1984 годзе па выніках Усесаюзнага агляду студэнцкіх будаўнічых атрадаў БПІ было прысуджана першае месца сярод вышэйшых навучальных устаноў СССР.

У гэты ж дзень, дакладней, у ноч з 26 на 27 кастрычніка, у Мінску прайшла ноч камсамольскага кіно «Час выбраў нас». У кінатэатры «Камсамолец» гараджанам і гасцям сталіцы з 22 гадзін вечара да 6 гадзін раніцы дэманстравалі аднайменную пяцісерыйную стужку Міхаіла Пташука, знятую на кінастудыі «Беларусьфільм». Фільм расказвае пра гераічную барацьбу камсамольцаў-падпольшчыкаў у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Гэта толькі невялікая частка мерапрыемстваў, якія прайшлі ў краіне да 100-годдзя ВЛКСМ.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Каб ніколі больш...

ІДЗІ І ПОМНІ... ДЗЕЛЯ ЖЫЦЦЯ

Штогод лунінецкая моладзь ідзе «Маршам жыцця» ў памяць аб бязвінна загінулых падчас Вялікай Айчыннай вайны жыхарах вёскі Мелясніца.

Ідэйны натхняльнік «Маршу жыцця» — журналіст, краязнаўца, пісьменніца Таццяна Канапацкая — расказвае лунінецкай моладзі пра трагічны лёс Мелясніцы.

Дождж, вецер ці апошнія сонечныя промні — усё адно. Гарадскія хлопцы і дзяўчаты ўвосень абавязкова збіраюцца каля абеліска на ўскрайку вёскі. Разам з імі — прадстаўнікі мясцовай улады, духавенства, Чырвонага Крыжа. Нехта ідзе сюды пешшу, хтосьці едзе на машыне, а некаторыя — на веласіпедзе. Мелясніца хоць і схаваная ў лясным гушчары, але ад горада да яе рукой падаць — усяго два кіламетры. У цішыні чуваць шаша і чыгунка, якія знаходзяцца непадалёку. Але куды гучней шумяць векавыя сосны, што памятаюць трагедыю, якая здарылася ўвосень 1943 года: нямецка-фашысцкія захопнікі знішчылі дзве трэці жыхароў, хаты спалілі...

— Пра страшны лёс Хатыні і вёсак, якія яго паўтарылі, усе ведаюць з урокаў гісторыі. Аднак разбіраючы гэтую тэму ў класе, да канца не разумееш маштабы людскога гора. Калі сам прыходзіш ці прыязджаеш у спаленыя населеныя пункты, стаіш каля абеліскаў са знаёмымі лунінецкімі прозвішчамі, даведваешся, як гінулі твае равеснікі, бачанне тых трагічных падзей змяняецца, — падзялілася ўражаннямі гімназістка Наталля Золатава.

Адзіная вуліца сучаснай Мелясніцы носіць назву Партызанская. Вёска з самага пачатку Вялікай Айчыннай вайны стала прытулкам для народных мсціўцаў, якія хаваліся ў лясных гушчарах. Сярод жыхароў былі сувязныя. Мелясніца ўвесь час жыла ў чаканні нядобрага: цэлымі сем'ямі начавалі ў лесе. Але ноч перад трагедыяй выдалася надзвычай дажджлівай і халоднай, таму людзі вырашылі перачакаць непагадзь дома. Раніцай яны апынуліся ў пастцы ворагаў: немцы і паліцаі ачапілі вёску з усіх бакоў...

Шлях «Маршу жыцця» вучні лунінецкай гімназіі праклалі ў 2013 годзе, і цяпер не адна восень не праходзіць для іх без візіту ў Мелясніцу. Сёлета да гімназістаў далучыліся навучэнцы політэхнічнага і сельскагаспадарчага каледжаў Лунінца, адзінаццацікласнікі сярэдняй школы № 1. На зямлю продкаў прыехала і маладая лунінчанка Таццяна Санюковіч. У той трагічны дзень яе дзядуля з бабуляй цудам засталіся жывымі, але немцы не пашкадавалі іх малодшых дзяцей — застрэлілі проста ў калысках. Дарэчы, асабліва пранікаюцца хлопцы і дзяўчаты, калі агучваюць мартыралогі — спісы імёнаў загінулых. Сярод іх у асноўным дзеці і моладзь, старыя.

Мелясніца ўвекавечана на «Дрэве жыцця» мемарыяльнага комплексу «Хатынь» як адзін з тых населеных пунктаў, што адрадзіліся пасля вайны. Маладыя лунінчане шчыра здзіўляюцца такой прывязанасці да роднай зямлі: тыя, хто цудам выратаваўся, праз некаторы час вярнуліся на папялішчы, жылі ў зямлянках, а пасля нанова адбудавалі вёску. Па «вялікія магчымасці» ў горад ніхто не пабег — засталіся на малой радзіме не толькі за сябе, але і за тых сваякоў, сяброў, суседзяў, якія загінулі. Пры гэтым жыхары Мелясніцы, якім пашчасціла застацца жывымі, не праглі помсты. Вядома, што пасля вайны ў вёсцы жыў адзін з прадстаўнікоў нямецкай нацыянальнасці. Калі ў 1970-х ён памёр, яго пахавалі суседзі.

І ўсё ж цяпер большасць мелясніцкіх хат пустуе. Прычым не толькі з восені да вясны, а зусім. Таму мясцовыя гаспадыні гасцям заўсёды рады.

У кампаніі гаваркіх мелясніцкіх жанчын вылучаецца адна — зусім невысокая, худзенькая, у акуратна павязанай хустцы. Гэта Яўгенія Прыходзька. Яе на Лунінеччыне даўно называюць «жыццесцвярджальным сімвалам» Мелясніцы, бо нарадзілася яна ў лесе праз месяц пасля знішчэння вёскі. Так нітка жыцця на гэтай зямлі не перарвалася, цягнецца сёння і будзе ісці далей, пакуль маладыя помняць.

* * *

Дарэчы, Мелясніца — толькі адна з вёсак Лунінецкага раёна з «вогненай гісторыяй», але не адзіная, дзе падрастаючае пакаленне ладзіць памятныя акцыі і мітынгі. Увесну гімназісты і школьнікі абавязкова наведваюць самы аддалены ад райцэнтра населены пункт — Лугі, дзе ў 1943 годзе ў агні загінулі 137 яго жыхароў. А летам злёт моладзі Лунінеччыны па традыцыі праходзіць каля возера Белае, дзе калісьці таксама была вёска, што знікла з усіх геаграфічных картаў пасля вайны.

Ганна КУРАК, фота аўтара.

Мінск — Лунінецкі раён — Мінск.

Сляды ў гісторыі

Кветкі для няскораных

Студэнты першага курса факультэта журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ўшанавалі памяць загінулых у гады Вялікай Айчыннай вайны патрыётаў, усклалі кветкі да помніка «Сляды» (скульптар А. Анікейчык) у цэнтральным Аляксандраўскім скверы каля Купалаўскага тэатра.

26 кастрычніка 1941 года ў акупаваным Мінску ўпершыню з'явіліся шыбеніцы для мірных грамадзян. Гітлераўцы падрыхтавалі адразу некалькі месцаў для смяротных экзекуцый, сагналі туды вялікую колькасць мінчан дзеля застрашвання. Немцы задумалі ў самым пачатку, у зародку падавіць усялякае супраціўленне. (Больш падрабязна пра гэта можна пачытаць у нарысе «Мінск здрыгануўся ад жаху: 26 кастрычніка 1941 года», змешчаным у кнізе дацэнта кафедры тэорыі і метадалогіі журналістыкі БДУ, колішняй супрацоўніцы газеты «Звязда» Таццяны Падаляк «Вайна — самы страшны грэх: маральна-публіцыстычны дослед».)

Гэта было першае публічнае смяротнае пакаранне ў горадзе. Потым у акупаваным Мінску, як і па ўсёй Беларусі, шыбеніцы для патрыётаў сталі з'яўляцца рэгулярна. Але нягледзячы на акупацыю, канцлагеры, гвалт, «вогненныя вёскі», беларускі народ не стаў на калені.

Дар'я ТРАВУЛЬКА,
Юлія ЯНОВІЧ (фота),
студэнткі І курса
факультэта журналістыкі БДУ.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
1 11 2018 г.

Свой выбар

ПСІХАЛОГІЯ СТАБІЛЬНАСЦІ

Вясковая настаўніца пра дзяцей, адзнакі і рыбалку

Сельская моладзь часта марыць перабрацца ў сталіцу: больш магчымасцяў, а значыць, і шанцаў знайсці сваё месца ў жыцці. Таццяна СЫМАНОВІЧ не з ліку такіх людзей. Настаўніца пачатковых класаў і педагог-псіхолаг ужо 14 гадоў працуе ў Пяршайскім дзіцячым садзе — сярэдняй школе, што пад Валожынам, і рада, што лёс занёс яе сюды.

Прафесію Таццяна выбрала, натхніўшыся прыкладам уласных школьных настаўнікаў. Успамінае, што ёй вельмі пашанцавала: у яе выкладалі добрыя педагогі. Любімым прадметам у дзяўчыны ў дзяцінстве была матэматыка. Але з ёй не звязала жыццё, бо заўсёды думала, што ведае дысцыпліну на недастатковым узроўні. Гэта, дарэчы, адзіны прадмет, па якім у Таццяніным школьным атэстаце стаяла «добра» — па астатніх было «выдатна».

Пасля заканчэння Мінскага педагагічнага каледжа яе накіравалі ў Пяршайскую школу настаўніцай беларускай мовы і літаратуры. А потым Таццяна стала выкладаць у пачатковых класах. З якім узростам працаваць складаней, адказаць адназначна нельга, гаворыць педагог.

— Калі працуеш у старшых класах, больш часу адымае падрыхтоўка да ўрокаў. Кожны год трэба перачытваць вялікія творы, каб успомніць усе дэталі і быць гатовай адказаць на пытанні вучняў. А з малодшымі школьнікамі складаней у плане дысцыпліны. Заўважыла, што калі перайшла працаваць у пачатковую школу, стала павышаць голас, — дзеліцца назіраннямі суразмоўніца.

Адзнакі, лічыць Таццяна, не самае галоўнае. Дзіця варта накіроўваць на атрыманне ведаў і ацэньваць іх аб'ектыўна. Калі школьніку паставілі «восем», а ён ведае на «пяць», гэта горш для самога вучня: трэба, каб ён асэнсоўваў свой узровень. «Яшчэ і з бацькамі даводзіцца работу праводзіць, каб яны не патрабавалі зашмат ад дзіцяці. Ціск шкодны для псіхічнага здароўя школьніка. Але, як правіла, такім бацькам складана гэта растлумачыць. Напрыклад, у сітуацыі, калі мама была выдатніцай, а сын — не, ёй няпроста змірыцца з гэтым».

— А што рабіць, калі дзіця не хоча вучыцца?

— Пастарацца зацікавіць. Я хлопчыкам кажу: будзеце непісьменнымі, адправіце дзяўчынцы, якая падабаецца, паведамленне з памылкамі, а яна будзе з вас смяяцца. А калі не навучыцеся лічыць, вас у краме могуць падмануць. Мне, дарэчы, падабаецца, што капейкі вярнуліся: дзецям зручней з імі лічыць.

Ідэі для ўрокаў Таццяна шукае ў інтэрнэце, падглядае падчас курсаў. Для вучняў малодшых класаў, кажа, найлепшы варыянт — заняткі ў гульнявой форме: такія падабаюцца нават слабым школьнікам.

Настаўніца стараецца быць у курсе таго, чым цікавіцца малеча. «У мяне пляменніца іх узросту, таму, калі што, у яе пытаюся, — усміхаецца. — Але я сучасныя мульцікі не зусім разумею, прывыкла да тых, на якіх сама выросла, «Ну, пачакай!» напрыклад».

На думку Таццяны, для педагога важныя такія якасці, як добрасумленнасць, эмпатыя

і асабліва справядлівасць. «Самае галоўнае — ставіцца да ўсіх аднолькава. Вядома, у мяне ёсць любімчыкі, але я іх стараюся не вылучаць».

У якасці педагога-псіхолага Таццяне даводзіцца разбіраць розныя пытанні. Напрыклад, праводзіць заняткі па інтэрнэт-бяспецы, прафарыентацыі. Бацькі ў кабінет псіхолага звяртаюцца, каб праверыць дзіця на гатоўнасць да школы, папрасіць папрацаваць з малымі над павышэннем самаацэнкі.

Сярод абавязкаў таксама наведванне сем'яў, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы. Педагог з сумам заўважае: некаторыя з іх патрабуюць пільнага нагляду, бо ў бацькоў праблемы з алкаголем. Але як толькі яны кідаюць піць, сітуацыя наладжваецца.

Закранаем матэрыяльны бок прафесіі. Некаторыя настаўнікі расчароўваюцца пасля атрымання першага заробку. Таццяна прызнаецца: гэта не пра яе. «З-за грошай ніколі не расстройвалася. Колькі атрымала, столькі і размеркавала. Я не зайздрошчу тым, хто больш зарабляе».

Прынамсі, на ўласнае жыллё ў настаўніцы пакрысе сабраць атрымалася: купіла кватэру ў Валожыне.

Вольнага часу, адзначае Таццяна, не так і шмат, а калі ёсць, любіць пачытаць мастацкую літаратуру і з'ездзіць да мамы ў вёску Сасноўцы Валожынскага раёна — на сваю малую радзіму. Суразмоўніца дзеліцца: для яе палоць грады і вырошчваць памідоры — сапраўдны адпачынак. Таксама ёй, як вясковаму чалавеку, падабаецца хадзіць у грыбы, збіраць ягады і ездзіць на рыбалку.

На пытанне, чаму вырашыла застацца жыць у райцэнтры, а не скараць сталіцу, Таццяна адказвае: выбрала стабільнасць. «Я прааналізавала: Валожын — невялікі гарадок, дзе я рэальна магу купіць сабе кватэру. Да таго ж усё неабходнае для жыцця тут ёсць: кінатэатр, басейн, рэстараны». А яшчэ настаўніца любіць Валожын за цішыню і спакой, якія яна не гатова прамяняць на шумны Мінск.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ,
фота аўтара.

Мінск — Валожынскі раён — Мінск.

У пошуках сябе

НАВУЧЫЦЬ... НАТХНЯЦЦА

Ёсць людзі, якія натхняюць сваімі выказваннямі, дзеяннямі, думкамі... Часцей за ўсё гэта любімыя паэты, пісьменнікі, мастакі, палітыкі. А ёсць тыя, хто не проста натхняе, але і вучыць гэтаму іншых. Сярод такіх — пісьменніца і выкладчык пісьменніцкага майстэрства Кацярына ААРО. Мяккая і далікатная, шчырая і адкрытая, яна з лёгкасцю набывае новых сяброў.

«Дагэтуль на старонцы быў сухі тэкст, — так пачынаецца прадстаўленне Кацярыны на яе асабістым бізнес-сайце «Натхніць на раман». — Вучылася на факультэце журналістыкі і ў Літаратурным інстытуце імя М. Горкага. Выдала кніжку, за якую атрымала прэмію. Выкладала, пісала, рэдагавала, знаходжуся... Але мне хочацца змяніць інтанацыю і прапанаваць вам гарбату». За гэтым сказам — цэлая захапляльная гісторыя жыцця жанчыны ад маленства да сённяшніх дзён. Як вы маглі зразумець, банальныя, нікому не цікавыя ці занадта ўзвышаныя тэксты — гэта не пра Кацярыну. У кожным запошчаным на сайце матэрыяле — цікавінка, якая прываблівае не толькі тых, хто хоча навучыцца пісаць кнігі, але і больш вопытных, самадастатковых.

Піша пра сваё маленства: у сем гадоў пераехала з Крыма ў Беларусь — і факт разбаўляе сваімі пачуццямі, перажываннямі, успамінамі. «Тут я ўпусціла кавун... А тут мы падцягваліся з суседам на галінцы інжыра, каб ухапіць ротам ягады», — успамінае яна самыя дарагія ёй месцы ў любімым горадзе. Далей жвава расказвае пра сваю першую, зробленую самастойна для выратавання ад суму дзіцячую газету. Пра арганізаваны гурток па журналістыцы для школьнікаў, які ператварыўся ў сапраўдную «літаратурную майстэрню». Актыўная і жыццярадасная, яна яшчэ падчас вучобы паспела знайсці працу па душы — на радыё. Калі ёй стала не хапаць творчасці, не пабаялася паступіць у Маскоўскі літаратурны інстытут. Пасля завяла свой блог, а потым і сайт, дзе прапаноўвала ахвотным навучыцца пісьменніцкаму майстэрству. Зараз сайт «Натхніць на раман» папаўняецца цікавымі фактамі, мастацкімі тэкстамі Кацярыны, яе разважаннямі. Паколькі жанчына жыве ў Францыі, заняткі могуць праходзіць па відэа-канферэнц-сувязі, што ў наш час — даволі распаўсюджаная практыка.

Калі выпадае магчымасць, Кацярына прыязджае ў Беларусь. Дні на радзіме заўсёды праходзяць плённа: распланавана кожная гадзіна. У адзін з такіх прыездаў яна вырашыла падзяліцца досведам са студэнтамі журфака.

Утульная кавярня, цёплая гарбата, духмяная кава — нефармальная сустрэча... Некалькі дзяўчат з факультэта сціпла сядзяць у чаканні лекцыі ад пісьменніцы. Але Кацярына дае іншую ўстаноўку: «Раскажыце пра сябе, пра тое, чым хочаце займацца». І мы дзелімся планамі, перажываннямі і страхамі, абмяркоўваем будучыню журналістыкі, друкаваных выданняў.

Кацярына таксама расказвае пра сябе і свой досвед працы, жартуе і вучыць. Пры гэтым зусім не цісне сваім аўтарытэтам. Нягледзячы на розніцу ва ўзросце, мы адчуваем сябе з ёй на роўных, давяраем ёй на сто працэнтаў, і нам здаецца, што мы знаёмыя ўжо шмат гадоў...

Напрыканцы Каця падзялілася з намі адным сакрэтам па пабудове тэкстаў. А на развітанне — запрасіла дадавацца ў сябры на «Фэйсбуку» і шчыра паабяцала, што мы можам звяртацца да яе па параду ў любой сітуацыі і ў любы час.

Пасля сустрэчы не пакідала неверагоднае пачуццё лёгкасці, упэўненасці ў сваіх сілах. Я зразумела: у мяне ёсць галава для думак, рукі, каб пісаць. І магчымасці. Варта толькі захацець...

Юлія АДАМОВІЧ,
студэнтка IV курса
факультэта журналістыкі БДУ.

Мары збываюцца!

ІГА-ГАШКІ — НАПЕРАД!

Кожны хлопчык марыць аб сваім коніку.
А кожная дзяўчынка — аб казачным аднарогу!
У гэтым упэўнена мінскі майстар Эвеліна МЯЦ.

— Аднойчы ішла і ўбачыла, як дзяўчынка скача на палцы, упрыгожанай стужкамі. І адразу ўспомніла, як у дзяцінстве мне вельмі-вельмі хацелася коніка... І я вырашыла выканаць мару — пашыла яго, толькі ўжо не для сябе, а для дачушкі Аленкі. З гэтага і пачалася гісторыя іга-гашак! І вось ужо на працягу больш як двух гадоў дзяўчаткі і хлопчыкі з Беларусі, Расіі, Амерыкі, Германіі і Аўстраліі катаюцца на маіх цацках.

Эвеліна робіць іх двух памераў: для дзетак да трох гадоў, такія конікі меншыя, і вялікіх. Аднойчы іга-гашку заказалі на дзень нараджэння нават дарослай дзяўчыне — каб здзівіць.

— Самае складанае ў маёй рабоце — гэта ювелірная праца з вочкамі, вейкамі. А яшчэ — давесці да ідэальнай роўнасці палку — каб маленькія ручкі не параніліся.

Марына БЕГУНКОВА,
фота аўтара.

Модны трэнд

БАРБЕР — «УКАРАЧАЛЬНІК» БАРАДЫ

Моднае цяпер слова прыйшло да нас з англійскай мовы. У перакладзе — цырульнік. А англійскае слова ўтворана ад лацінскага barba, што ў сваю чаргу азначае «барада». Барбер — гэта чалавек, якому сучасны мужчына можа смела даверыць стрыжку, афармленне вусоў, барады або зрабіць сабе «каралеўскае» галенне. Сёння мы пазнаёмімся з барберам Аляксандрам КУДРЫЦКІМ з аднаго са сталічных барбершопаў і даведаемся пра самае цікавае ў яго працы.

— Стрыгчы я пачаў з 14 гадоў. Калі збіраліся з сябрамі ў двары, яны давяраліся мне, нягледзячы на тое, што былі і кур'ёзныя моманты. Аднойчы ў сябра пасля маёй чарговай аўтарскай стрыжкі ўся галава была ў шрамах і цякла кроў. Але ніхто не злаваўся, было весела. Калі я ўжо дакладна вырашыў, што хачу быць цырульнікам, бацькі, аднакласнікі, многія сябры круцілі галавой і казалі: «Гэта не мужчынская прафесія». Затое цяпер ніхто не дзівіцца і не асуджае, наадварот, распытваюць з цікавасцю і просяць запісаць іх да мяне, каб падстрыгчы бараду або зрабіць класную прычоску, — кажа Аляксандр.

Як стаць барберам? «Можна скончыць сярэднюю спецыяльную навучальную ўстанову па спецыяльнасці «Цырульніцкае майстэрства», а можна прайсці адпаведныя курсы. Глядзець на «Ютюбе» розныя відэаролікі, хадзіць на семінары, майстар-класы — таксама дапамога ў навучанні. Яшчэ адзін спосаб — папрацаваць памочнікам у дасведчанага спецыяліста. Важная ўмова — стараннасць, мэтанакіраванасць, і будзе плён», — раіць суразмоўнік.

Інструменты для барбера — важныя рэчы. Кожны работнік атрымлівае ў салоне фен і машынкі для стрыжкі, а вось астатняе трэба дакупляць самастойна. «З кожным разам разумею, што трэба ўсё больш, а кошт прылад для стрыжак зусім не нізкі». Дарэчы, якая розніца паміж назвамі «барбер» і «цырульнік»? Аляксандр кажа, што па сутнасці яе няма, але некаторыя адрозненні ў працы першых і другіх прысутнічаюць. У барбершопе аказваюць абмежаваны спектр паслуг — там працуюць выключна з мужчынамі: голяць небяспечнай брытвай, робяць стайлінг барады і вусоў. У некаторых асабліва модных установах таксама прадаюць аксесуары і нават адзенне для мужчын, а яшчэ могуць зрабіць татуіроўку або пірсінг.

— У нас працуе выключна мужчынскі калектыў, таму размовы паміж майстрам і кліентам ідуць на адпаведныя тэмы. Дарэчы, стасункі — неад'емная частка працы барбера. Для мяне не праблема пачаць размову з новым кліентам, але заўсёды гляджу, як настроены сам чалавек: адзін нясе станоўчую энергетыку і гатовы жартаваць, а другі пануры і закрыты, тады я разумею, што лезці не трэба, — гаворыць Аляксандр. — У нашым барбершопе праводзяцца сумесныя майстар-класы, часам мяне запрашаюць правесці семінар, падзяліцца вопытам, якога ў мяне набралася ўжо 16 гадоў. Напрыклад, калі на стрыжку барберу даецца гадзіна, я за гэты час і стрыжку раблю, і бараду стрыгу. Часта прыходзяць хлопцы з канкрэтным фота і кажуць: «Я хачу так». У большасці выпадкаў гэта можна паўтарыць і зрабіць усё крута, але бывае, што стрыжка не падыходзіць для канкрэтнай формы галавы або ў чалавека ад прыроды прабор на правы бок, а ён хоча на левы. Таму я прапаноўваю альтэрнатыву, пераконваючы, чаму лепш зрабіць па-іншаму.

У мяне стрыгуцца вядомыя спартсмены, спевакі, бізнесмены, музыканты, рэжысёры, простыя кліенты. Прыходзяць як хлопчыкі 11—12 гадоў, так і людзі за 50. Кожны дзень — новы вопыт, сяброўства, незабыўныя эмоцыі. Барбер — чалавек творчы, з тонкім густам і прасторавым мысленнем. Як і ў любым рамястве, трэба набірацца вопыту, не баяцца працаваць з людзьмі і пастаянна ўдасканальвацца. Я падтрымліваю стасункі са знаёмымі з розных краін і магу сказаць, што многія хваляць беларусаў за працаздольнасць і высокі ўзровень майстэрства.

Дар'я ШЛАПАКОВА,
студэнтка IV курса
факультэта журналістыкі
БДУ.

Усё да твару

Хобі ў падтрымку хараства

Падавалася б, настаўнік матэматыкі не павінен асабліва разбірацца ні ў чым, акрамя формул і лічбаў, але Кацярына КАНАНЧУК імкнецца данесці ўсім іншае... Яна нарадзілася ў Мазыры, але на вучобу паехала ў Мінск, цяпер выкладае ў сталічнай гімназіі № 8. У Кацярыны Аляксееўны ёсць не зусім звычайнае хобі — яна вядзе б'юці-блог у сацыяльнай сетцы «Інстаграм». Сёння суразмоўніца раскажа нам аб сваім захапленні, якое стала для яе не толькі прыемным баўленнем часу, але яшчэ і выдатнай нагодай для новых знаёмстваў.

— Мая маці — настаўніца матэматыкі, таму я, лічыце, патомны выкладчык гэтага прадмета. Заўсёды яго разумела.

І зноў жа мама яшчэ ў дзяцінстве «прыклала руку» да майго захаплення касметыкай: яна страшэнна любіла яе. Усе шафкі дома былі забіты рознымі слоічкамі, цюбікамі, пэндзлікамі. Але ў гэтым была перавага і для мяне. У школу ўсім забаранялася фарбавацца, але калі твая мама — настаўніца, то табе дазвалялася крышачку больш, чым астатнім...

— Як даўно пачалі весці б'юці-блог?

— Першыя спробы былі пяць гадоў таму, але тады яны не скончыліся поспехам. Свядома пачала падыходзіць да гэтай справы каля двух гадоў таму, калі стварыла блог, які вяду і цяпер. Спачатку, вядома, мяне пераследавалі розныя цяжкасці, напрыклад, ахоп аўдыторыі быў невялікі, і з гэтай нагоды нават хацелася ўсё кінуць. Цяпер вельмі задаволена, што не зрабіла гэтага.

— А як да вашага занятку ставіцца сям'я, сябры?

— Амаль усе — выдатна, падтрымліваюць. Некаторыя, вядома, пытаюцца, навошта гэта мне, кажуць, што ў нас за такое хобі ніхто не плаціць і плаціць не збіраецца. Але я, хутчэй, раблю ўсё для душы. Дарэчы, мама любіць патэлефанаваць мне і сказаць: «Каця, час выкладаць новы пост. Каця, трэба напісаць пра тое, ты забылася расказаць пра гэта. Каця, адкажы на каментарый». Яна хвалюецца за блог больш, чым я сама. Але ж занятак гэты досыць няпросты. Мала таго, што трэба не забыцца расказаць пра ўсе навіны, адказаць на каментарыі і падзяліцца досведам, трэба рабіць усё ў час і пажадана ў добрай якасці. Я вельмі здаволена, што мама так мяне падтрымлівае.

— Можа, у яе таксама ёсць свой блог?

— Пакуль што няма.

— А якая рэакцыя на ваша хобі ў вучняў?

— Вучаніца неяк сказала, што перастане чытаць мой блог, калі я пастаўлю ёй «двойку». Не самае прыемнае пачуццё... Насамрэч відаць, што яны жартуюць, так што дрэнныя адзнакі, калі што, можна ставіць смела.

— Планы на будучыню?

— Думаю разам з сябрам запусціць праект, які будзе нагадваць гэткі часопіс у інтэрнэце. У ім плануем размяшчаць інфармацыю не проста накшталт «глядзіце, я купіла новы слоічак з касметыкай», а падрабязна расказваць, для чаго яна прызначана. З апісаннем складу, каб кожны змог падабраць нешта для сябе. Вельмі спадзяюся, што праект сябе апраўдае.

Настасся СУРЫНАВА,
вучаніца 11 класа гімназіі № 8 г. Мінска.

ШЧАСЦЕ ТВАРЫЦЬ...

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Сведения об объекте	Одноэтажное, состоит из 1-го пролета. Длина: 131,84 п. м, ширина: 24,27 п. м; Крыша (кровля): рулонные кровельные материалы; полы: бетон; централизованная система холодного водоснабжения и канализации; вентиляция с естественным побуждением. Ввод в эксплуатацию – 1970 г.	Одноэтажное, состоит из 1-го пролета. Длина: 131,9 п. м, ширина: 17,87 п. м; Крыша (кровля): рулонные кровельные материалы; полы: бетон; вентиляция с естественным побуждением. Ввод в эксплуатацию – 1970 г.	– помещение формовочного цеха, арматурного цеха с бетоносмесительным центром: площадь – 18836,2 кв. м, в том числе здание арматурного цеха – 4230 кв. м, бетоносмесительный центр – 206 кв. м; – крыша (кровля): рулонные кровельные материалы; полы: бетон; централизованная система холодного водоснабжения и канализации; вентиляция с естественным побуждением. Ввод в эксплуатацию – 1970 г.; – склад готовой продукции: площадь – 14347 кв. м, 4 пролета, (материал покрытия площадки: цементобетон, колонны железобетонные с металлическим каркасом). Ввод в эксплуатацию – 1973 г.; – здание очистных сооружений: площадь 205 кв. м, крыша (кровля): рулонные кровельные материалы; полы: бетон; централизованная система холодного водоснабжения и канализации; вентиляция с естественным побуждением; – 2 (два) резервуара для воды: материал – бетон; наружная площадь: 108 кв. м; объем: 300 куб. м. Ввод в эксплуатацию – 1994 г.; – комплект гаражей: площадь – 66,8 кв. м, одноэтажное, крыша (кровля): рулонная битумная; полы: бетон; вентиляция естественная. Ввод в эксплуатацию – 2010 г.; – железнодорожный путь: протяженность – 3981,7 м. Ввод в эксплуатацию – 1971 г.

Организатор аукциона	Ликвидационная комиссия ОАО «Пинский КСИ», ТУП «ПриБут»
Продавец аукциона	Ликвидационная комиссия ОАО «Пинский КСИ», ТУП «ПриБут»

Аукцион состоится **16 ноября 2018 года в 11.00** по адресу: г. Пинск, ул. Калиновского 11 в актовом зале ОАО «ПКСИ».

Перечень необходимых документов:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с ОАО «Пинским комбинатом строительной индустрии».

2. Заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка: на расчетный счет ОАО «Пинский комбинат строительной индустрии» р/счет BY16BAPB30124701200210000000 в ОАО «Белагропромбанк», г. Минск, БИК BAPBBY2X , УНП 200305504, срок внесения суммы задатка – по 15 ноября 2018 г. включительно.

3. Индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации и его подлинник для заверения его копии организатором торгов.

4. Юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица, и их подлинники, для заверения их копий организатором торгов.

5. Представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также документ, подтверждающий его полномочия.

Организатор торгов имеет право отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до даты его проведения.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену.

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона возместить затраты на оценку, организацию и проведение аукциона; подписать договор купли-продажи недвижимого имущества в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Порядок проведения аукциона определен в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Пинск, ул. Калиновского 11, каб. 2 с 9.00 до 15.00 по рабочим дням по 15 ноября 2018 года включительно, тел. 80165-37-16-19, тел./факс (80165) 37-16-66. Контактный телефон – 375-29-640-80-37

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
1 11 2018 г.

SEX=БАЛЯСЫ

У ЛОЖКУ З ГАДЖЭТАМ

«Страшную вестку прынёс я ў твой дом, Надзея! Кліч дзяцей!» Памятаеце гэтую фразу з фільма «Любоў і галубы»? Дык вось, і вестка непрыемная, і клікаць хутка не будзе каго... Сумныя лічбы абнародавалі нядаўна эканамісты з амерыканскага ўніверсітэта Дэлавера: калі ў 1990 годзе ў сярэднестатыстычнага чалавека секс быў пяць разоў на месяц, дык у 2010 годзе (больш позні час чамусьці ў даследаванні не фігуруе) яго колькасць скарацілася да трох за той жа «справаздачны перыяд». Інакш кажучы, уцех кахання ў нашым жыцці становіцца ўсё менш... Падавалася б, такога што, раней не было? («Калі ў вашай жонкі баліць галава, паспрабуйце прыкласці ёй да лба новыя італьянскія боцікі». Ведаеце, гэта ў многіх выпадках паспяхова спрацоўвала для абодвух бакоў. «Калі б кожны раз, калі я ўсведамляю, якой дурніцай я была, мне давалі б 10 рублёў, у мяне была б пастаянная крыніца пасіўнага даходу».) Але на гэты раз усё нашмат сур'ёзней, паколькі, на думку аўтара навуковай працы, пачуццёвыя адносіны паміж мужчынамі і жанчынамі выцясняюць электронныя сродкі камунікацыі... («Мы апошняе пакаленне людзей, чые дзіцячыя фатаграфіі не былі зроблены пры дапамозе тэлефонаў».)



Прафесар разам з калегамі прааналізавала даследаванні, якія ахопліваюць лад жыцця чатырох мільёнаў чалавек з 80 краін на пяці кантынентах. А штуршком стаў выпадак, які адбыўся ў 2008 годзе на Занзібары — архіпелагу, які належыць Танзаніі. Тут у выніку аварыі быў пашкоджаны сілавы кабель, які забяспечваў падачу электраэнергіі з мацерыка на востраў. У выніку апошні на месяц застаўся без электразабеспячэння. («Самае шкоднае для нервовай сістэмы — гэта марудны інтэрнэт».) І вось гэта надзвычайнае здарэнне мела нечаканы працяг. Эканаміст з універсітэта Арэгона звярнуў увагу, што праз восем-дзевяць месяцаў пасля той аварыі на Занзібары назіраўся сапраўдны бэбі-бум: колькасць нованароджаных падскочыла на 15—18 працэнтаў. Ага, яшчэ зусім нядаўна з гэтай нагоды гаварылі проста: цемра — сябра моладзі... Самае цікавае, што гэты эфект датычыўся толькі электрыфікаваных населеных пунктаў. У вёсках, якія і дагэтуль былі без электрычнасці, не змянілася нічога, бо іх насельнікі як жылі да аварыі, так і працягвалі жыць. («Мне ніколі не будзе так весела, як людзям у рэкламе безалкагольнага піва».)

А вось тыя жыхары вострава, што прызвычаіліся карыстацца выгодамі цывілізацыі, мусілі праводзіць дома больш часу. А тэлевізар жа не працуе, смартфон не зарадзіш! Што яшчэ рабіць доўгімі цёмнымі вечарамі?!. («Адключылі інтэрнэт на дзесяць хвілін. Даведаўся, што зараз вясна, вывучыў пакоі ў доме, пазнаёміўся з бацькамі, даведаўся, што ёсць брат».) Інакш кажучы, вучоныя пацвердзілі сувязь паміж наяўнасцю ў сям'і тэлевізара і ўпадкам сексуальнага жыцця. («Планшэт быў вынайдзены для таго, каб людзі нарэшце перасталі сядзець у інтэрнэце і маглі ў ім ляжаць».) Апошняга, як высветлілі даследчыкі, як мінімум на шэсць працэнтаў робіцца менш.

Але на адзін толькі тэлевізар навукоўцы грашыць на спяшаюцца. Яны кажуць, што яшчэ большым забойцам сексу з'яўляюцца смартфоны. І пацвярджаюць свае высновы лічбамі: у ЗША людзі ў сярэднім праводзяць за імі 11 гадзін у дзень. («— У цябе кругі пад вачыма. — Гэта межы рэальнасці».) Гэта час і за інтэрнэтам, і за гульнямі, і за праслухоўваннем музыкі... («Калі твой мужык не афішуе вашы адносіны ў сацсетках, дык гэта не толькі твой мужык».) За апошнія тры гады ён павялічыўся на 1 гадзіну 32 хвіліны. Тое, што раней можна было патраціць на секс, цяпер выдаткоўваецца на стасункі з гаджэтамі, калі экран тэлевізара гасне... («У век супертэхналогій з намі побач часцей спяць тэлефоны, чым блізкія людзі».) Зносіны з жывымі прадстаўнікамі процілеглага полу замяняюцца віртуальнымі, многім становіцца больш цікава сачыць за імі, чым удзельнічаць у іх. («Перапоўнены аўтобус, людзей у салоне — як селядцоў у бочцы. Раптам з пярэдняй пляцоўкі чуецца ўсхваляваны жаночы голас: «Мужчына, што вы робіце? Мужчына, я ў вас пытаюся — што вы робіце?!» Усе пасажыры сціхаюць. Паўза... Нарэшце ўжо з задняй пляцоўкі аўтобуса даносіцца зацікаўлены мужчынскі голас: «Мужык, ну не тамі! Сапраўды, што ты там робіш?») Нехта шукае разрадкі ў фільмах «для дарослых». Ці знаходзіць? («Дэпрэсія — гэта калі прагляд стужкі «для дарослых» заканчваецца доўгімі роздумамі пра цяжкі лёс галоўнай гераіні».) Паказальная гісторыя адбылася нядаўна ў Мінску. У 45-гадовага мужчыны на балконе жылля ў шматкватэрным доме выявілі... парсюка. Смешна? Хутчэй наадварот. Грамадзянін растлумачыў, што набыў жывёлу на рынку і гадаваў у кватэры, бо пражываў адзін і яму было сумна...

І зусім іншая гісторыя пра 100-гадовую брытанку, якая выйшла замуж за абранніка, маладзейшага за яе на 26 гадоў. («Бачыў, як дзяўчына бегла па горадзе ў вясельнай сукенцы. Вось гэта я разумею — у актыўным пошуку».) Яны былі шмат гадоў знаёмыя. Жаніх адвёз нявесту да алтара на інваліднай калясцы пад песню ABBA. А жанчына сказала: «Быць нявестай — гэта проста ашаламляльна. Гэта каштавала столькі гадоў чакання, я магла б пачакаць і даўжэй». Што тут скажаш, олдскульная школа! («Трымаюся ад граху як мага далей, але не выпускаю яго з віду».)

Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.

«КРЭМ З ШАЛУПІННЯ — ВЕЛЬМІ СМАЧНА!»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— Праз стравы мы даносім да людзей свае думкі, — расказвае Мікіта. — З сябрамі ездзім у лес, збіраем шышкі, крапіву, іншыя дары прыроды. Вось прыгатавалі варэнне з шышак, а потым рабілі з ім марожанае. Інгрэдыенты звычайныя, але мы прымяняем нестандартныя тэхнікі, якім навучыліся — нехта за мяжой, хтосьці ў вёсцы.

Сам фармат аўтарскіх вячэр Мікіта падглядзеў падчас паездак за мяжу. У Швецыі ён пабываў на адной з такіх у мішленаўскім рэстаране і прыйшоў у захапленне.

— Па такім прынцыпе працуюць у многіх краінах, — кажа суразмоўнік. — Туды нельга проста зайсці, каб паесці, трэба спачатку запісацца. Ёсць рэстараны, куды запіс вядзецца за паўгода да наведвання. Мы пачалі практыкаваць такое ў нас, і ўжо ёсць пастаянныя кліенты.

ПАПКОРН З ГРЭЧКІ

Мікіта паралельна працуе ў мінскім вінным бары, дапамагае распрацоўваць стравы, да якіх, як ён удакладняе, Магілёў яшчэ не гатовы. Нават у сталіцы не заўсёды здольныя прыняць нешта з таго, што ён прапануе. На першы погляд, некаторыя рэцэпты сапраўды крыху шакуюць. Пагадзіцеся, крэм з бульбянога шалупіння — гэта занадта смела.

— Але і вельмі смачна, бо чымсьці нагадвае каву з вяршкамі, — парыруе суразмоўнік. — Такога дэсерту вы дакладна нідзе не пакаштуеце, толькі ў нашым бары. Мы запякаем шалупінне і варым са згушчонкай, якую таксама робім самі.

Паступова ў меню бара прапісаліся соус з крывянкі, вэнджанае сэрца, кампот з кабачкоў і алычы, безалкагольнае марожанае з пахам... самагону. Дэсерт з кабачкамі, алычой і марожаным падаецца як адно цэлае пад назвай «Бабулін ананас» (кабачкі з кампоту сапраўды чымсьці падобныя на ананас). Дарэчы, у бары наогул усе стравы камбінаваныя. Асобна адбіўную ці пюрэ тут не падаюць. На талерцы — прадукт, створаны з некалькіх кампанентаў. Тое, што было знойдзена шляхам шматлікіх проб і выклікала адабрэнне экспертаў, а потым і спажыўцоў.

— Для стравы галоўнае — смак, карысць, а потым усё астатняе, — дзеліцца спецыяліст. — Я доўга падбіраю інгрэдыенты, прапорцыі, спрабую па сто тысяч разоў, каб дасягнуць незвычайнага выніку. Спалучаю прадукты па колеры — абляпіха-гарбуз, хурма-гарбуз-абляпіха. Грэчка для мяне наогул любімы прадукт. Мы нават рабілі з яе папкорн. А нядаўна знайшлі для сябе валлёвую залозу. Па тэкстуры яна нагадвае белыя грыбы. З залозай робім бульбяныя клёцкі, яны атрымліваюцца вельмі далікатныя і смачныя.

Не апошнюю ролю адыгрывае якасць інгрэдыентаў. Напрыклад, каб атрымаць добрае мяса, трэба як след даглядаць жывёлу, арганізаваць правільнае харчаванне, сачыць за тым, каб яна не хварэла. І ў бары знайшлі такіх пастаўшчыкоў. А яшчэ тут умеюць распазнаваць, ці атрымала рыба стрэс, калі яе лавілі. Тая, што спужалася, больш цвёрдая і ў працэсе прыгатавання развальваецца.

Звярнуцца да вытокаў беларускай кухні хлопца натхнілі скандынавы. Яны шмат квасяць, мочаць, сушаць і ў гэтым вельмі падобныя на нашых продкаў.

— Мы проста забыліся, наколькі гэта смачна, — дзеліцца суразмоўнік. — І зараз спалучаем старыя метады з навацыямі. У гэтых эксперыментах нараджаюцца абсалютна новыя стравы. У нас ёсць дэсерт, у якім выкарыстоўваецца скарыначка ад барадзінскага хлеба. Спачатку прыдумалі дэсерт, а потым задумаліся: дзе іх набяром столькі? У выніку навучыліся рабіць скарыначкі самі. Іх, дарэчы, прапануем разам з вышэйзгаданым бульбяным крэмам.

КАМАНДА НА АДНОЙ ХВАЛІ

Побач з маладым чалавекам працуе і яго жонка Маша. Хлопец і дзяўчына пазнаёміліся падчас сумеснай работы ў магілёўскім рэстаране і адразу ж адчулі, што яны — на адной хвалі. Маша знайшла сваё прызванне ў прафесіі самелье — эксперта ён, у бары яна адказная за спалучэнне гэтых напояў з ежай.

Такіх жа аднадумцаў Мікіта знайшоў дзякуючы сваім шматлікім сяброўскім сувязям. Атэстацыю шэф-повара прайшлі... выкладчык англійскай мовы, зваршчык, двое хлопцаў з вучылішча і студэнт з універсітэта харчавання.

— На жаль, нам вельмі не хапае тых, хто працуе за ідэю, — кажа Мікіта. — Высокая зарплата — гэта добра, але кухар — пакуль не тая прафесія, дзе можна шмат зарабіць. Спачатку трэба стаць майстрам, а потым рабіць кар'еру.

Дарэчы, хлопец спачатку таксама не вельмі спадзяваўся рэалізавацца ў сябе на радзіме. Але зараз яго думкі наконт гэтага змяніліся. Апошнім часам людзі сталі больш падарожнічаць і спрабаваць нешта новае. Яны вяртаюцца дадому, і ім хочацца зноў перажыць тыя ж адчуванні. І тады ім на дапамогу прыходзіць Мікіта са сваёй камандай. «У нас ёсць госці, якія ездзяць у Італію шэсць гадоў запар, але наша рызота ім больш падабаецца, чым тамтэйшае», — усміхаецца малады чалавек.

Сёння Мікіта — запатрабаваны спецыяліст. Яго запрашаюць на майстар-класы, карыстаюцца яго рэцэптамі. Але ён не спачывае на лаўрах. Зараз вывучае англійскую мову, каб з'ездзіць на стажыроўку ў якую-небудзь са скандынаўскіх краін. Не для таго, каб скапіяваць чужыя стравы, а каб глыбей унікнуць у іх тэхналогіі, тэхнікі. І парадаваць нас з вамі новымі незвычайнымі стравамі.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве
«Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.008.
Нумар падпісаны ў 19.30 31.10.2018 г.

ВЯРТАННЕ ПАМЯЦІ:

МЕМАРЫЯЛ «КАНЦЛАГЕР ДАХАУ» ПРОСІЦЬ ДАПАМАГЧЫ ЎСТАНАВІЦЬ ІМЁНЫ АХВЯР

За два кіламетры ад асноўнага лагера Дахау ў 1941—1942 гадах было забіта звыш чатырох тысяч савецкіх ваеннапалонных. Сёння на тэрыторыі расстрэльнага поля створаны музей пад адкрытым небам, які распавядае пра здзейсненыя злачынствы. У цэнтры экспазіцыі — біяграфіі асобных ахвяр. Але гісторыя тых падзей яшчэ працягвае стварацца — супрацоўнікі музея па крупінках збіраюць інфармацыю, вышукваюць імёны, спрабуюць ідэнтыфікаваць ахвяр, просяць адгукнуцца сведкаў ці сваякоў забітых.

Побач з асноўнай экспазіцыяй — прытопленыя ў зямлю пліты, размешчаныя такім чынам, каб паказаць месца забойства і нагадаць, што падчас расстрэлаў ахвяр выстройвалі ў шарэнгі па пяць чалавек. На плітах — таблічкі, на якіх кіріліцай і лацінкай пазначаны прозвішчы забітых, даты іх нараджэння і смерці. На цяперашні момант удалося ўзнавіць імёны толькі каля васьмі соцень ахвяр... Але супрацоўнікі мемарыяла не спыняюць даследаванняў і спадзяюцца, што экспазіцыя будзе дапаўняцца новымі стэндамі і, самае галоўнае, што будзе вернута памяць: сваякі, якія лічылі сваіх дзядоў, бацькоў, братоў «зніклымі без вестак» падчас Другой сусветнай вайны, нарэшце змогуць даведацца пра іх лёс.

Загад аб камісарах

«Яшчэ да нападзення нацысцкай Германіі на Савецкі Саюз, 6 чэрвеня 1941 года, быў выдадзены так званы «Загад аб камісарах», са зместам якога былі азнаёмленыя ў вусным парадку ўсе нямецкія дывізіі. Сутнасць яго была ў тым, што палонных камісараў і палітрукоў належала адразу расстрэльваць. Ну і яўрэяў, натуральна, таксама. Сярод ваеннапалонных звесткі аб расстрэлах распаўсюдзіліся вельмі хутка, таму палітычныя кіраўнікі і яўрэі стараліся схавацца пад выдуманымі імёнамі», — расказвае каардынатар праекта Андрэа Рыдле.

Многім сапраўды на некаторы час удалося затаіцца. Але нацысты прадбачылі такую сітуацыю. Пры вялікай колькасці ваеннапалонных (а да сярэдзіны жніўня 1941 года ў германскім рэйху іх было ўжо больш за 150 тысяч) гэта стварала небяспечную сітуацыю, існавала верагоднасць, што афіцэры змогуць арганізаваць супраціўленне ў лагерах. Пачалося паляванне на «ідэйна шкодных элементаў», у час якога пацярпелі не толькі афіцэры і яўрэі, але і палонныя, якіх палічылі падазронымі («прафесіянальныя рэвалюцыянеры», «бунтаўшчыкі», асобы, якія спрабавалі ўцячы, і проста інтэлігенцыя, маўляў, апошняя таксама здольная ўзняць людзей на бунт). Сартавалі ахвяр спецыяльныя айнзацкаманды (часцей за ўсё яны складаліся з прадстаўнікоў гестапа). Камендантылагераў выдзялялі баракі для правядзення допытаў, адгароджаныя тэрыторыі для адсартаваных і пры неабходнасці ўзброены канвой для суправаджэння.

Магчыма, вы іх ведаеце...

Так званых непрымальных палонных адпраўлялі на знішчэнне ў найбліжэйшыя канцэнтрацыйныя лагеры. Побач з Дахау знаходзіўся лагер для палонных афіцэраў. Палігон СС Хебертсгаўзен, дзе сёння створаны мемарыял, стаў месцам найбольш масавых расстрэлаў асоб, адсартаваных згодна з «Загадам аб камісарах». На жаль, менавіта такой катэгорыі ахвяр, як ваеннапалонныя, у ранейшыя часы ўдзялялася недастаткова ўвагі. Але нават сёння, калі пасля тых жахлівых падзей мінула ўжо больш за сем дзесяцігоддзяў, яшчэ многае можна зрабіць для таго, каб увекавечыць памяць пра гэтых людзей.

Зразумела, ніякіх расстрэльных спісаў не існавала, трупы крэміраваліся — нацыстам неабходна было схаваць сляды злачынстваў. Але тым не менш знайсці інфармацыю пра знішчаных чырвонаармейцаў можна. Справа ў тым, што на кожнага савецкага ваеннапалоннага заводзіліся персанальныя карткі, у якіх пазначаліся прозвішча, год і месца нараджэння, а таксама адрас і прозвішча сваякоў, якіх варта было б праінфармаваць пра лёс ваеннапалоннага, напрыклад, пра яго гібель.

Пасля заканчэння Другой сусветнай вайны такія дакументы трапілі ў розныя архівы (на сённяшні дзень некаторыя з іх ёсць у адкрытым доступе ў інтэрнэце, нешта ўдалося адсканаваць з закрытых архіваў) і даследчыкі музея-мемарыяла «Канцлагер Дахау» сталі працаваць з гэтай крыніцай.

Але ўзніклі праблемы з ідэнтыфікацыяй: некаторыя з ваеннапалонных маглі рэгістравацца пад прыдуманымі імёнамі. Не заўсёды пасля выяўлення сапраўдных прозвішчаў немцы іх выпраўлялі, але адрас і прозвішчы сваякоў, пазначаныя ў персанальных картках, як правіла, падаваліся сапраўдныя. І сёння, каб аднавіць і ўвекавечыць імёны ахвяр, супрацоўнікі музея-мемарыяла Дахау просяць адгукнуцца сваякоў расстраляных афіцэраў.

На сайце «Звязды» апублікаваны поўны спіс людзей, інфармацыю пра якіх спрабуюць адшукаць даследчыкі на тэрыторыі нашай краіны. Вось толькі асобныя з іх. Учытайцеся ўважліва, можа, сярод іх ёсць вашы блізкія.

Ст. лейтенант Абрамович Максим Адамович, 1906 г.р. Д. Негновичи Борисовский р-н Минская область, попал в плен в июне 1941 Алитус, содержался в офлаге XIIID, передан гестапо Нюрнберг 16.02.1942. Родственники: Адамович А.П. ул. Милицейская д. 7 г. Чаусы Могилевская область.

Лейтенант Казаков Иван Иосифович, 1918 г.р. Д. Паломка Могилевская область, попал в плен в июле 1941 вокзал Негорская, содержался в офлаге XIIID, передан гестапо Нюрнберг 27.01.1942. Родственники: Ковалева Анна, д. Паломка Костюковичский район Могилевская область.

Мл. политрук Астапов Василий Семенович, 1916 г.р. г. Гомель, попал в плен в июне 1941, место пленения неизвестно, содержался в офлаге XIIID, передан гестапо Нюрнберг 10.09.1941. Родственники: Астапов Семен, г. Гомель, ул. Мильчанская д. 3а.

Ст. лейтенант Егоров Федор Васильевич, 1909 г.р., Горьковская область, попал в плен в июне 1941 место пленения неизвестно, содержался в офлаге XIIID, передан гестапо Нюрнберг 05.11.1941. Родственники: д. Малиновка Руденский район Минская область.

Красноармеец Ольшанский Владимир Ефимович, 1916 г.р. г. Рогачев, попал в плен в июле 1941 Минск, содержался в шталаге VA, передан гестапо Штутгарт 26.01.1942. Родственники проживали в г. Рогачев. ул. Бобруйская.

Красноармеец Сазанов Сергей Федорович, 1914 г.р. г. Ардатов, попал в плен в июне 1941 г. Барановичи, содержался в шталаге VC, передан гестапо Дахау 10.08.1942. Родственники: ул.Фрунзе 38, ст. Пуховичи Минская обл.

Спіс мы друкуем на рускай мове — у тым выглядзе, у якім ён быў прадстаўлены ў рэдакцыю. Заўважым, што нямецкія даследчыкі самастойна перакладалі прозвішчы ахвяр расстрэлаў з лацінкі на кірыліцу. Да таго ж усе звесткі сабраны ў 1941 годзе, калі савецкіх ваеннапалонных бралі на ўлік, заводзілі на іх анкеты. Таму тут могуць сустракацца недакладнасці ў падачы прозвішчаў і назваў населеных пунктаў.

Поўны спіс — на сайце zviazda.by. Калі знайшлі ў ім кагосьці знаёмага — патэлефануйце або напішыце ў рэдакцыю.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

Даты Падзеі Людзі

1 ЛІСТАПАДА

У краіне

1868 год — нарадзіўся (в. Казьяны, цяпер у Шумілінскім раёне) Дзмітрый Іванавіч Даўгяла, беларускі гісторык, архівіст, археограф. З 1897 года — архіварыус Віцебскага цэнтральнага архіва старажытных актаў, затым — член Віленскай археаграфічнай камісіі. Рэдактар «Записок Северо-Западного отдела Русского географического общества», ганаровы член Віцебскай вучонай архіўнай камісіі. З 1925 года — супрацоўнік Інбелкульта, дацэнт БДУ, дырэктар бібліятэкі АН Беларусі. Вывучаў гісторыю беларускіх гарадоў і мястэчак, гісторыю нацыянальных меншасцяў у Беларусі, абарончыя збудаванні краіны. Публікаваў помнікі беларускай дзелавой пісьменнасці. Укладальнік і рэдактар «Гісторыка-юрыдычных матэрыялаў», удзельнічаў у выданні «Актаў Віленскай камісіі», «Археаграфічнага зборніка дакументаў». Адзін з укладальнікаў «Гісторыі Беларусі ў дакументах і матэрыялах» і інш. Памёр у 1942 годзе.

1903 год — нарадзіўся Дзмітрый Фаміч Філімонаў, партыйны і дзяржаўны дзеяч Беларусі. У 1955—1957 гадах — першы сакратар Гомельскага абкама КПБ, у 1957—1968 гадах — сакратар і член Бюро ЦК КПБ, у 1962—1964 гадах — старшыня бюро ЦК КПБ па кіраўніцтве прамысловасцю і будаўніцтвам. Памёр у 1978 годзе. Яго імем названа вуліца ў Мінску.

1903 год — нарадзіўся (в. Лабковічы, цяпер у Крычаўскім раёне) Кузьма Венядзіктавіч Кісялёў, дзяржаўны дзеяч Беларусі, дыпламат, кандыдат медыцынскіх навук. З 1937 года — наркам аховы здароўя БССР, у 1938—1940 гадах — старшыня СНК БССР, у 1946—1966 гадах — міністр замежных спраў Беларусі. Меў ранг Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла. На чале дэлегацыі БССР у 1945 годзе на канферэнцыі ў Сан-Францыска падпісаў Статут ААН, у 1947 годзе па выніках Парыжскай мірнай канферэнцыі (1946) — мірныя дагаворы БССР з Балгарыяй, Венгрыяй, Італіяй, Румыніяй і Фінляндыяй. Узначальваў дэлегацыі БССР на сесіях Генеральнай Асамблеі ААН у 1946—1965 гадах. Памёр у 1977 годзе.

У свеце

1512 год — Мікеланджэла Буанароці завяршыў роспіс зводу Сікстынскай капэлы — адной з найважнейшых парадных залаў Ватыкана.

1798 год — нарадзіўся Бенджамін Лі Гінес (1798—1868), ірландскі піававар і першы лорд-мэр Дубліна. Сёння піва Guinness вядома ва ўсім свеце.

1908 год — нарадзілася (г. Мінск) Яўгенія Эргардаўна Пфляўмбаўм, беларуская паэтэса. З 1930 года працавала ў Кніжнай палаце пры Дзяржаўнай бібліятэцы Беларусі імя Леніна, у газеце «Звязда». У 1933-м выехала ў Сібір за сваім рэпрэсаваным мужам паэтам М. Лужаніным. З 1945 года жыла ў Мінску. Аўтар паэтычных зборнікаў «Сувой жыцця», «На захадзе сонца». Перакладала з англійскай — Джорджа Байрана і Джэка Лондана, і з рускай — прозу і драматургію Антона Чэхава і Максіма Горкага. Памерла ў 1996 годзе.

1990 год — у адпаведнасці з указам Прэзідэнта СССР М. С. Гарбачова ў Савецкім Саюзе быў уведзены камерцыйны курс рубля да замежных валют (да таго адзін амерыканскі долар каштаваў 50,54 капейкі).

■ Валянцінкай

З ТАГО СВЕТУ

...Яблыні дзед Архіп садзіў каля вуліцы, прычым прынцыпова: казаў, што гэта — добрае месца.

На той час — і сапраўды, відаць: машын у вёсцы амаль не было — ні сваіх, ні чужых, а вось людзей — многа. І ўсе, на думку дзеда, харошыя. «Вось будуць міма нашай хаты ісці, — разважаў гаспадар, — і па яблычку сарвуць альбо апалы падымуць ды пачастуюцца. Глядзіш — добрым словам успомняць».

І бярозавы сок ён заўсёды збіраў: слоікамі, вёдрамі цягаў у склеп, зліваў у велікаватыя бочкі, дабаўляў трохі цукру, сухога хлеба і вінаграду — пакідаў брадзіць. Каб потым, у летнюю спёку, насіць гатовы прадукт не столькі сабе ў хату — каб людзей частаваць: прыпыняць на той жа вуліцы, перакідвацца слоўцамдругім, а нарэшце казаць: «Пастой, браток (ці сястрыца...), у мяне ж бярозавік ёсць. Мігам прынясу».

Паабяцаўшы, дзед і сапраўды спрытна «заныраў» у досыць глыбокі склеп, набіраў у кубкі халоднага квасу: піў, вядома ж, і сам, але конча з некім, бо «адзін ты з'еш хоць вала, адна і хвала».

Гэтае правіла жыцця дзед даводзіў спачатку дзецям — і сваім, і чужым, потым унукам ды ўнучкам, адна з якіх — самая «малая» і ўжо гараджанка, прыняўшы ў спадчыну хату, з сёлетняй вясны па выхадных прыязджае з сям'ёй у дзедаву вёску — прыглядае за садам, разводзіць кветкі, вучыцца вырошчваць што-нішто з гародніны, як некалі з дзедам, ходзіць у блізкі лес.

...Вось і надоечы з грыбамі адтуль вярталася. Не сказаць, каб шмат назбірала, але, убачыўшы на лаўцы суседку-бабулю, прыпынілася: павітаўшыся, спытала (хоць магла і не пытаць, бо ведала...):

— Цётка Мар'я, вы ж у грыбы не ходзіце? Дык падстаўляйце фартух, я вам трохі насыплю.

— Не, Светачка, не трэба, — стала бараніцца бабуля (фартух між тым ужо падстаўляючы). — Я — абыдуся. А ў цябе ж і муж ёсць, і дзеці — нясі сваім.

Свае — муж і пагодкі-дочкі — пакуль што спалі, але ж хутка маглі прачнуцца, прыйсці ў кухню снедаць. Таму гаспадыня адразу ж уключыла ў разетку чайнік, развяла міску цеста, узялася пячы бабуліны бліны. І ўжо там, ля пліты (мазгі ж не тэлевізар, іх не выключыш), міжволі ўспамінаць свой ранішні паход: думаць, як з гадамі «псуецца», зарастае хмызняком іх лес (а смеццем — сцежкі ды ўзлескі), як — вочы б не бачылі! — «шарэюць» ад сумніку пазакіданыя гароды, а самае балючае — як хутка старэюць і адыходзяць людзі... Тую ж цётку Мар'ечку ўзяць. Яе Палятушкай некалі звалі, бо яна, адна гадуючы дзяцей, і сапраўды не хадзіла — птушкай лётала, а вось зараз зранку сядзіць на лаўцы...

Зрэшты, не (Света праз акно зірнула на вуліцу): зараз таксама некуды «ляціць» — з кійком, але ж гэтак хутка...

«Да нас? Чаго? — здзівілася Света і ўміг спахмурнела. — Няўжо за грыбы мне дзякаваць будзе? Яшчэ чаго не хапала!»

Бабуля між тым ужо адчыняла дзверы, з парога занепакоена пытала:

— Ты не грыбочкі смажыш?

— Не, што вы... Яны яшчэ неперабраныя стаяць. Рукі не дайшлі, — далажыла Света. — На сняданак будуць бліны са смятанай.

— Вось і добра, што не з грыбамі... Давай мы разам на іх паглядзім, бо ты, дзіцятка, трохі воўчых прынесла...

— Не можа быць! Мне ж дзядуля ўсе паказваў. Я незнаёмых не брала.

— А яны цяпер так «маскіруюцца» — не разбярэш. Але ж гэта во, — дастаўшы грыб з кішэні, паказала бабуля, — белая паганка. І апенек вось гэтых людзі не ядуць.

...Света выключыла пліту (ужо не да бліноў было), разам з суседкай, у чатыры рукі, яны хутка перабралі-перагледзелі ўсе грыбы і знайшлі сярод іх яшчэ тры неядомыя.

Для таго каб (крый бог!) атруціць сям'ю, хапіла б, кажуць, і аднаго.

...Чым аддзячыць бабулі за тое, што перасцерагла, ураторавала ад бяды, — Святлана не ведала.

Як не ведала яна і таго, чым жа аддзячыць... дзеду — за яго крылатае «адзін ты з'еш хоць вала, адна і хвала».

Валянціна ДОЎНАР.

P. S. *Сярод любімых дзедавых прыказак была, дарэчы, яшчэ адна. Даводзячы некаму з халастых ці незамужніх, што трэба жаніцца, што ў сям'і — ці хоць бы ў пары — лепей век пражывеш (пра алкаголікаў ды наркаманаў тады ў вёсцы не чулі), дзед казаў, што чалавеку, вядома ж, добра аднаму... Але толькі ў прыбіральні.*

P. P. S. *А яблыні яго — тыя, пры самай вуліцы — усё яшчэ растуць.*

І яблыкі на іх па-ранейшаму смачныя!

Гэта вам хто хочаш скажа, бо ў акрузе няма, здаецца, людзей, якія (нават маючы сады) дзедавых не каштавалі б.

ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ
«ВЫИГРАЙ ПУТЕВКУ В СТРАНУ ЛЮБИМОГО ЛЕГИОНЕРА»

1. Организатором рекламной игры является Молодежное спортивное общественное объединение «Мини-футбольный клуб «Столица» (далее – Организатор), УНП 194903495.

Юридический адрес: Республика Беларусь, г. Минск, пр-т Независимости, д. 187, корп. 7Н, каб. 36. Электронный адрес: info@fcstalitsa.by.

Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры – +375296334036.

Заинтересованное лицо рекламной игры – ООО «Пальма Трэвел».

2. Наименование рекламной игры: «Выиграй путевку в страну любимого легионера».

3. Территория проведения игры.

Республика Беларусь.

4. Срок начала и окончания рекламной игры, включая срок выдачи выигрышей и опубликования результатов проведения рекламной игры: с 3 ноября 2018 года по 30 июня 2019 года.

5. Состав комиссии по проведению рекламной игры.

Председатель комиссии: Волощик Дмитрий Иванович – начальник отдела маркетинга и PR ООО «СОФТКЛУБ – Центр разработки».

Члены комиссии:

Петровский Ян Юрьевич – специалист по маркетингу ООО «СОФТКЛУБ – Центр разработки»;

Сержанина Анастасия Ивановна – специалист по туризму ООО «Пальма Трэвел»;

Ахрамович Алексей Петрович – Председатель правления МСОО «Мини-футбольный клуб «Столица»;

Халимончик Дмитрий Анатольевич – юрисконсульт МСОО «Мини-футбольный клуб «Столица».

6. Наименование товаров (работ, услуг), в целях стимулирования реализации которых проводится рекламная игра.

Игра проводится с целью стимулирование продажи билетов на домашние матчи МСОО «Мини-футбольный клуб «Столица».

7. Условия участия и порядок отбора участников рекламной игры.

К участию в игре допускаются:

• граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие в Республике Беларусь;

• иностранные лица и лица без гражданства, имеющие вид на жительство на территории Республики Беларусь, постоянно проживающие в Республике Беларусь.

7.1. Для участия в рекламной игре необходимо:

7.1.1. В период с 00:00:01 3 ноября 2018 года по 23:59:59 15 июня 2019 года включительно совершить покупку не менее 3-х билетов на домашние матчи МФК «Столица»;

7.1.2. В период с 16 июня 2019 года с 15.00 до 18.00 необходимо зарегистрироваться для участия в Розыгрыше:

– получить у представителя Организатора, находящего в период с 16 июня 2019 года с 15:00 до 18:00 по адресу: пр-т Независимости, 196 (Дворец спорта «Уручье») в фойе 2-го этажа, регистрационную анкету;

– заполнить анкету, указав следующую информацию: фамилия, имя, отчество участника (полностью), почтовый адрес участника (будет использован Организатором при уведомлении участника о выигрыше), номер телефона участника в формате «код оператора, номер абонента» (пример – 29XXXXXXX, где 29 – код оператора, а XXXXXXX – номер абонента, без пробелов и символов);

– вернуть заполненную анкету представителю Организатора;

– получить у представителя Организатора, в соответствии с количеством предоставленных билетов, пронумерованные фишки, с уникальным номером (далее – «фишки») в хронологическом порядке согласно дате и времени регистрации участника (1 фишка равняется 3-м билетам с различных посещенных домашних матчей МФК «Столица»). Одна фишка передается участнику, вторая, вместе с регистрационной анкетой, остается у Организатора.

7.2. Каждый участник может принимать участие в Игре неограниченное количество раз при условии выполнения требований, необходимых для участия в Игре.

7.3. Каждый участник должен сохранять билеты до момента регистрации участника.

7.4. Каждый участник должен лично присутствовать при регистрации для участия в Розыгрыше.

8. Состав и размер призового фонда рекламной игры и источники его формирования.

Таблица 1

№ п/п	Наименование приза	Определение приза	Количество	Стоимость
1	Туристическая услуга на двоих, направление – Италия, или Испания, или Россия, или Украина	Туристическая услуга включает: – проживание не менее 2 ночей в отелях 2* и лучше; – питание ВВ (завтрак) и лучше; – переезд на автобусе туристического класса	1	400 бел. руб.

Количество туристов, которым могут быть оказаны туристические услуги, двое.

Срок предъявления выигрышной фишки, в течение которого Победитель должен заключить договор ООО «Пальма Трэвел» (УНП 191756554, г. Минск, ул. Сурганова, д. 61, пом. 82, http://www.palmatravel.by) на оказание туристических услуг и для оплаты предъявить сертификат, – до 30.07.2019 года.

Срок действия выигрышной фишки, в течение которого Победитель отправляется в путешествие согласно заключенному договору на оказание туристических услуг, в счет оплаты которого предъявляется сертификат, – до 30.10.2019 года.

9. Место, дата, время и порядок проведения розыгрыша призового фонда, порядок определения победителей. Срок и способ информирования победителей.

9.1. Розыгрыш проводится 1 (один) раз открыто в присутствии комиссии 16 июня 2019 года в 18.10 по адресу: пр-т Независимости, 196 (Дворец спорта «Уручье»).

9.2. Все игровые фишки, участвующие в Розыгрыше, засыпаются в лототрон и перемешиваются, затем один из членов комиссии произвольно достает из лототрона одну фишку, которая становится Победителем Розыгрыша, которая получает туристическую услугу на двоих.

9.3. За ходом Розыгрыша следит комиссия по проведению рекламной игры.

9.4. Победитель будет уведомлен по почте в срок до 20.06.2019 года, а также дополнительно по контактному номеру телефона, предоставленному участником, согласно пункту 7.1 настоящих правил.

10. Место, порядок и срок выдачи выигрыша.

10.1. Приз можно получить до 30 июня 2019 года включительно по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, д. 187, корп. 7Н, каб. 36, с 11.00 – 18.00, с понедельника по пятницу, а также в субботу 22 июня 2019 года с 11.00 до 17.00.

Дату и время прибытия следует предварительно согласовать с представителем организатора по телефону +375298065999 в рабочие часы с 9.00 до 18.00. Звонок платный, в соответствии с тарифами операторов, услугами которых пользуется Участник.

10.2. При получении Приза победитель обязан представить следующие документы:

– фишку с номером, полученную в процессе регистрации для участия в Розыгрыше;

– оригинал документа, удостоверяющего личность.

10.3. В случае если победитель Розыгрыша, претендующий на получение приза не обеспечивает соблюдение условий правил или не забирает Приз до срока 30.06.2019 года включительно, то приз остается в распоряжении Организатора.

10.4. Факт участия в данной рекламной игре означает ознакомление и полное согласие с настоящими правилами.

10.5. Участвуя в рекламной игре, ее Победители соглашаются с тем, что любые их данные, в том числе имена, фамилии, отчества, фотографии и видеоизображения, могут быть использованы Организатором рекламной игры в рекламных целях в отношении проводимой Рекламной игры без предварительного согласия Победителя и без каких-либо денежных выплат.

10.6. В случае если Победителем Игры является несовершеннолетний участник, Приз выдается законному представителю (родителю, усыновителю, попечителю) при предъявлении документа, удостоверяющего личность и свидетельства о рождении ребенка (иного документа, подтверждающего представительство несовершеннолетнего лица).

10.7. Выплата денежного эквивалента стоимости приза либо замена другими призами не производится. Денежная компенсация за отказ от приза по каким-либо причинам или в случае, если приз не будет востребован в течение выше установленного срока, не выдается.

10.8. Организатор игры не оплачивает участникам рекламной игры расходы, связанные с проездом к месту получения приза.

11. Название печатного средства массовой информации, в котором будут опубликованы результаты проведения рекламной игры, а также сроки их опубликования.

11.1. Правила проведения рекламной игры подлежат опубликованию в газете «Звязда» до начала рекламной игры. Результаты рекламной игры будут опубликованы в газете «Звязда» до 20 июня 2019 года.

Телефон для справок: +375296334036.

Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 3414 от 25.10.2018 выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

Извещение о проведении повторного аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	Червенское районное потребительское общество, г. Червень, ул. Ленинская, 32

Предмет аукциона.
Местоположение – Минская обл., Червенский р-н, г. Червень

Наименование	Общ. площадь	Инв. номер	Адрес (улица, № дома)
Лот № 1			
Здание майонезного цеха	203 кв. м	615/С-16211	ул. К. Маркса, д. 21
Составные части: пристройка, сарай			
Сведения о земельном участке: пл. **0,0724** га предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания здания майонезного цеха			
Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 96 288,85 бел. руб.			
Лот № 2			
Магазин № 2	427,9 кв. м	615/С-16290	ул. К. Маркса, д. 9
Составные части: пристройка, два сарая пристройки, топочная			
Сведения о земельном участке: пл. **0,1793** га предоставлен на праве аренды по 29.01.2028 для обслуживания здания магазина № 2. Ограничения (обременения) прав – охранные зоны сетей и сооружений водоснабжения, пл. 0,0406 га			
Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 106 633,33 бел. руб. (снижена на 30 %)			
Лот № 3			
Магазин № 18	105,8 кв. м	615/С-16085	ул. Калинина
Составные части: склад, котельная, сарай, туалет			
Сведения о земельном участке: пл. **0,0264** га предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания и эксплуатации объектов торговли			
Начальная цена по лоту № 3 с НДС 20 % – 9 901,20 бел. руб. (снижена на 30 %)			
Лот № 4			
Магазин № 3	115,9 кв. м	615/С-16316	пер. Партизанский
Составные части: пристройка холодная			
Сведения о земельном участке: пл. **0,0364** га предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания и эксплуатации объектов торговли			
Начальная цена по лоту № 4 с НДС 20 % – 10 932,17 бел. руб. (снижена на 30 %)			

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, г. Минск, ул. Коллекторная, 11 БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи	**10** рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона

По лотам № 1 и № 2 – 30 % от цены продажи имущества, с учетом ранее внесенной суммы задатка, оплачиваются в течение 30 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи, оставшаяся сумма оплачивается ежемесячно равными долями, с учетом индексов цен производителей промышленной продукции производственно-технического назначения, с рассрочкой платежа на срок до 6 месяцев.

По лотам № 3 и № 4 – если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после подписания договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 21.09.2018

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Дата и время проведения аукциона: 13.11.2018 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703. **Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 12.11.2018 до 17.00** по указанному адресу. **Тел.: +375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. Email: auction@cpo.by**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

Извещение о проведении повторного аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ОАО «Белэнергозащита», г. Минск, пер. Бехтерева, д. 7

Предмет аукциона
Объекты недвижимого имущества, реализуемые одним лотом, в следующем составе:

Наименование (Назначение)	Общ. пл.	Инв. номер
Здание специализированное автомобильного транспорта (гараж) (здание специализированное автомобильного транспорта), в т. ч. дворовые сооружения	449,0 кв. м	500/С-51681
Адрес: г. Минск, ул. Бехтерева, д. 20А		
Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (материальный склад) (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ)	22,1 кв. м	500/С-51680
Адрес: г. Минск, ул. Бехтерева, д. 20а		
Тепловая сеть (сооружение специализированное коммунального хозяйства)	500/С-1024935	
Адрес: г. Минск, ул. Бехтерева, 20А (здание ул. Бехтерева, 20А/1) – здание (М))		

Сведения о земельном участке: пл. **0,2851** га предоставлен продавцу для эксплуатации и обслуживания здания специализированного складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, здания специализированного автомобильного транспорта и дворовых сооружений по ул. Бехтерева, 20А на праве постоянного пользования.

